**ДУА “Дворнасельская дзіцячы сад-сярэдняя школа”**

# Зерне ўваскрасае ў каласах…

Матэрыялы з вопыту работы

**Аўтары-складальнікі: Закрэўская Жанна Феліксскаўна,**

**Закрэўская Ніна Пятроўна**

*Сборнік уключае метадычныя матэрыялы з вопыту работы па фарміраванні сацыякультурнай пераемнасці пакаленняў.*

# Уступ

Важнейшай часткай маральнага выхавання вучняў з'яўляецца фарміраванне ў іх патрыятызму. Праблемы патрыятызму, стаўлення да Айчыны, Радзімы былі і застаюцца прадметам пастаяннай увагі мысліцеляў і даследчыкаў на працягу ўсёй шматвяковай гісторыі грамадскай думкі.

Уладзімір Караткевіч пісаў: *"Часам, у злыя гадзіны, я нават не ведаю, ці люблю я беларусаў, да якіх маю гонар належаць. За бязмежную цярпімасць да таго, чаго не трэба, за мяккасць, што мяжуе з рэптыльнасцю, за тое, што яны занадта сумленныя "верныя Янукі". Але нават у тыя хвіліны я разумею, з пагардай да самога сябе (бо яны – гэта я), што адна справа не любіць чалавека і зусім іншая – не ратаваць яго, калі ён топіцца.*

*Я стану ратаваць. Нават цаною гэтай паношанай скуры і спрацаваных мазгоў, якія падсохнулі ўжо і тарахкаюць. І хаця на таўшчыню воласа, на колькі хопіць маёй сілы, я прыбліжу да іх паратунак. Уратую іх*".

Задача педагогаў ратаваць дзяцей ад цынізму, абыякавасці, раўнадушша, ад духоўнай абмежаванасці, ад агрэсіўных адносін да таго, што выходзіць за межы ўласных уяўленняў аб жыцці. На жаль, сёння назіраецца збядненне духоўнага свету падрастаючага пакалення, перанасычэнне яго свядомасці звесткамі з Інтэрнэт, відэа- і аўдыяпрадукцыі, спадарожнікавага тэлебачання. Моладзь і падлеткі страчваюць сувязь з культурнай спадчынай народа.

Мы перакананы ў тым, што веданне гісторыі свайго краю, яго звычаяў, традыцый, абрадаў дазваляе па-новаму асэнсаваць мінулае, сучаснае і прадставіць будучае, сфарміраваць неабходныя каштоўнасныя арыенціры.

І педагогу, як нікому іншаму ў век цывілізацыі, трэба выконваць адказную місію – выхоўваць павагу да Радзімы, народа, культуры.

У зборніку прадстаўлены матэрыялы з вопыту выхаваўчай дзейнасці ўстановы адукацыі, якая накіравана на фарміраванне сацыякультурнай пераемнасці пакаленняў. Так як наша вясковая школа малакамплектная, то ў падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемстваў удзельнічалі вучні 5-11 класаў.

Адкрывае зборнік творчы праект "Зерне ўваскрасае ў каласах". Трэба адзначыць, што гэты праект выклікаў цікавасць школьнікаў, уцягнуў іх у вялікую падрыхтоўчую работу. Так, сумесна з дзецьмі была аформлена зала, складзены прэзентацыи, падабрана да іх музыка, развучаны вершы, песні, танец. Гэта праца спрыяла і эстэтычнаму выхаванню дзяцей, далучала іх да багацця і хараства, напрацаванага рукамі і душой нашага народа.

Сустрэча з мясцовымі жанчынамі дазволіла больш глыбока зразумець, наколькі таленавіты наш народ у розных сферах жыццядзейнасці. Мясцовыя народныя песні выклікалі цікавасць і жаданне дзяцей прадоўжыць знаёмства з імі. Фальклорнае свята "Лёс жанчыны – зараснік шыпшыны" дазволіла не толькі шырэй пазнаёміцца з песеннай спадчынай нашай мясцовасці, але і паказала адметнасць песень у выяўленні душы жанчыны.

Вывучэнне гісторыі роднага краю, збор фальклорнага матэрыялу, сустрэчы са знакамітымі землякамі спрыяюць фарміраванню патрыятызму. Яскравым прыкладам гэтага з'яўляецца свята-сустрэча з мясцовым паэтам Браніславам Марозом. Падчас свята вучні чыталі вершы, слухалі песні на словы Браніслава Мароза, цікавіліся творчым лёсам паэта. Пры правядзенні свята была наладжана выстава альбомаў і кніг паэта. У ходзе мерапрыемства вучні пазнаёміліся з

фільмамі "Міёры" і "100-годдзе Міёрскага касцёла" Васіля Мядзюхі, у якіх гучаць творы Б.Мароза.

Існаванне ў чалавека ўласнай самасвядомасці і пачуцця гонару за сваю радзіму з'яўляецца адным з асноўных кампанетаў асобы. Фарміраванню нацыянальнай годнасці вучняў садзейнічае правядзенне шматлікіх выхаваўчых мерапрыемстваў. Адно з іх – запрашэнне да роздуму "Якою цаной заваёва шчасце?".

Мерапрыемства прызначана для вучняў старэйшых класаў, так як яно не толькі ўзнаўляе і пашырае веды вучняў пра сваю Бацькаўшчыну, але і запрашае да роздуму, выказвання сваіх меркаванняў і поглядаў.

Пры правядзенні ўсіх мерапрыемстваў выкарыстоўваўся мясцовы матэрыял.

Матэрыялы, якія прадстаўлены ў зборніку, могуць быць карысны класным кіраўнікам, педагогам-арганізатарам, настаўнікам беларускай мовы і літаратуры пры правядзенні класных і агульнашкольных выхаваўчых мерапрыемстваў.

# Фальклорнае свята
## *“Зерне ўваскрасае ў каласах”*

**Мэта:** выхаванне ў навучэнцаў нацыянальнай самасвядомасці праз асэнсаванне нацыянальных каштоўнасцей, праз наладжванне сустрэчы з мясцовымі таленавітымі жанчынамі, праз творчую самарэалізацыю кожнага вучня.

Задачы:

- узбагаціць духоўную культуру дзяцей;
- выхоўваць павагу і пашану да працавітага і таленавітага нашага народа;
- стварыць умовы для развіцця творчага патэнцыялу кожнага вучня, для павышэння яго асабістага статусу.

*(Зала падрыхтавана да прыняцця гасцей: пад акном стаіць стол, засланы белым абрусам, ля яго – крэслы. Насупраць стала растаўлены крэслы для дзяцей. Ля сцэны злева – мультымедыйны экран. На падлозе разасланы саматканыя палавікі.)*

**Ход мерапрыемства**

*(На экране – першы слайд прэзентацыі.*
*Інсцэніроўка ўрыўка з трылогіі Я.Коласа “На ростанях”.)*

***Лабановіч***: Дык ты, бабка, не ведаеш, чаго мы на свеце жывём?

***Бабка:*** Не, панічок: не ведаю! <…> Жывём, покі жывецца, бо жывы ў зямлю не палезеш, а прыйдзе смерць, тады пахаваюць.

***Лабановіч:*** Так, бабка: ты кажаш праўду. Не ведаем мы, чаго на свеце жывём.

***Бабка:*** А навошта, панічку, і ведаць? Жыве чалавек і жыве, пакуль Бог яму прызначае. А прыйдзе час яму памерці – памрэ…

*(На сцэну выходзяць вядучыя.)*

***Арцём:*** Як не дзіўна, але менавіта смерць падводзіць апошнюю рысу зямному існаванню чалавека, робіць усіх роўнымі перад вечнасцю, вызначае велічыню зробленага людзьмі.

***Маша:***Нікому не ўдаецца пазбегнуць адказу на яе мудрыя пытанні: “Дзеля чаго жыў, чалавек, змагаўся, пакутаваў? Што было важным у тваім жыцці?”

***Арцём:*** Што цаніў? Ці дапамог? Ці абагрэў? Ці падказаў? Цяпер, на мяжы быцця і небыцця, агледзься, азірніся, адкажы”.

***Маша:*** Гаспадар памірае, а рэчы яго застаюцца.
Рэчам што да людскіх незваротных аплаканых спраў?
І талеркі, і шклянкі на шчасце, па прымаўцы, б’юцца,
А бывае ж праз рэчы і брат свайму брату не брат.

***Арцём*:** Рэчы – зменлівы ідэал. Няўжо для іх варта старацца,
Калі гэтак бяздумна кідае ўладальніка рэч?
Ты ўглядаешся ў трумо, і другі ў яго будзе ўглядацца.
І канапы твае ад другога не кінуцца прэч.

***Маша:*** Ад таго, што цябе нейкім часам не стане на свеце,
Піяніна тваё не заплача ніводнай струной,
Тэлефон не знямее, і плёнка ўцалее ў касеце,
І ў слязах халадзільнік не пойдзе ў цябе за труной.

***Арцём:*** Набывай, але помні, што рэч не галоўны набытак
І не першае месца займае ў тваёй галаве.
Той, хто жыў для багацця, памрэ – і ўсімі забыты.

Той, хто жыў для людзей, і па смерці з жывымі жыве.

*Вадзім Шэфнер (пераклад Язэпа Семяжона)*

***Арцём:*** А як жа застацца жыць вечна?

*(Пад словы вядучых дэманструюцца старыя фотаздымкі (слайды 2-18)*

***Маша:*** "Тыя, што пракладалі дарогі, - што засталося ад іх? Адны косці. І тыя трухлеюць і рассыпаюцца…

***Арцём:*** Можа, ішлі яны таксама, поўныя сіл, і думалі, што будуць жыць вечна і што слава іх дасягне нябёсаў…

***Маша:***Ашукаліся – ды хіба дарэмна ішлі? Вось крочым цяпер мы, успамінаем іх і ўдзячныя назаўсёды ім, першым…

***Арцём:*** Хай мы слабыя духам, адступаем – што з таго?

***Маша:***Царствы рассыплюцца, вецер развее каменныя збудаванні, а след, які праклалі першыя, застаўся…

***Арцём:*** І хаця іх імёны і вобразы сцёрліся – што з таго?"

*В. Іпатава*

***Маша:***Яны жывуць з намі сваёй духоўнай прысутнасцю. Адтуль, з Космасу, узіраюцца ў нашыя твары, пазнаючы ў нас свае рысы. Узіраюцца з пачуццём гордасці, падчас роспачы. Часам нават расчаравання, але заўсёды з надзеяй.

***Арцём:*** З надзеяй на тое, што мы, прадаўжальнікі іх роду, будземісці па зямлі людзьмі, спасцігаць мудрую навуку народнай педагогікі, у еднасці жыць з Сусветам, саграваць яго сваёй прысутнасцю.

***Маша:***Жыццё – лісцё, а памяць – карані.
Мы думаем і бачым каранямі.
І Кронас чарай поўнаю з краямі
Вітае тых, хто прагне глыбіні.

*Р.Барадулін*

***Арцём:*** Сплывае ўдаль, што маем…
А былое нібы набліжаецца да нас.
Пылінку праху раздзьмувае час –
І з мёртвага ўспыхвае жывое.

*М.Арочка*

*Адкрываецца заслона. Хатнік цягне куфэрак.*

***Хатнік:*** Дзень добры, паважаныя госці. Як добра, што вы да нас завіталі. Я ўсіх вас ведаю, бо я – Хатнік. Старажыл, можна сказаць. Усе думаюць, што хатнікі жывуць толькі ў дамах. Не-е-е! Памыляюцца. Я, для прыкладу, аблюбаваў Дворнасельскую школу.

Пачакайце, дык можа, я цяпер ужо не хатнік, а школьнік? Падумаю над гэтым пытаннем потым. Дзеці мяне назвалі Кузьмой, а ласкава – Ку-у-узя.

У школе ў нас цёпла, утульна. Сям'я харошая, дружная, вясёлая, гаманлівая. От, ведама моладзь! Вас, напэўна цікавіць, што я раблю ў школе?

О-о-о! У мяне шмат спраў. Я працую сувязным паміж мінулым і сучасным. Паміж тымі, хто сеяў зярняты мудрасці, і сённяшняй камп'ютарнай моладдзю. Разам з настаўнікамі клапачуся, каб зярняты давалі добрыя ўсходы. Мы паліваем гэтыя каласкі, песцім іх, галубім. І не трэба акіяна вады, дастаткова толькі кубачка, каб падтрымліваць іх жыццё. Што яшчэ я раблю ў школе? Бывае, я люблю паскакаць па партах, пастукаць у сцены або пераставіць школьныя рэчы, прыхаваць сшытачак, захінуць дзённічак. Бывае, што казаць! Вось зараз са

школьнага этнаграфічнага кутка валаку куфэрак. Вы, напэўна, хочаце ведаць, для чаго? Э-Э, не спяшайцеся з пытаннем. Усяму свая чарга. Скажу толькі, што дзеці чакаюць гасцей. Але што гэта я ўсё гавару, гавару. Глядзіце, калі ласка самі, што будзе далей. А я прыхаваюся.

*(Хатнік пакідае куфэрак і хаваецца.*
*Выходзіць дзяўчына. Прыбірае ў пакоі. Да яе падыходзіць хлопец.)*

***Алесь:*** Прыбіраешся, Ірынка?
***Ірына:*** Так, Алесь, гасцей чакаю. Трэба, каб усюды быў парадак і чысціня.
***Алесь:*** Ірынка, а давай я табе песню заспяваю. Можа, праца лепш будзе спорыцца.
***Ірынка:*** А, сапраўды, Алесь, заспявай.

*(Алесь спявае пад гітару песню "Ой, сівы конь бяжыць".)*

***Ірына:*** Алесь, а чаму ў цябе такі лірычны настрой? Ты, можа, закахаўся?
***Алесь:*** Ірына, ад цябе нічога нельга схаваць. Але ёсць яшчэ адна прычына майго настрою: я вельмі люблю народную песню.
***Ірына:*** О так, Алесь, мне яна таксама даспадобы. Вось слухай.

*(Спявае 1-ы слупок песні "Рэчанька".)*

***Ірына:*** Алесь! Заспяваліся з табой. Мы ж гасцей чакаем. Трэба парадак наводзіць.
***Алесь:*** І праўда, час хутка бяжыць. І не заўважым, як госці прыйдуць.

*(Ірына заўважае куфэрак.)*

***Ірына:*** Глянь, Алесь, што гэта за куфэрак? Адкуль ён тут узяўся?
***Алесь:*** А хто ж яго ведае. Ён жа ў этнаграфічным кутку быў. Сам прыйсці не мог. Значыць…
***Ірына:*** Значыць гэта Кузьма наш зноў жартуе. Кузь-ма-а! Дзе ты?.. Няма… Схаваўся.
***Алесь:*** Трэба неяк адцягнуць куфэрак з-пад ног, каб не замінаў.
***Ірына:*** Не спяшайся, Алеська. Наш Кузя нічога проста так не робіць. Для чагосьці ж ён яго сюды прывалок. У Кузі часта бываюць нейкія намёкі, недасказы.
***Алесь:*** А давай адчынім ды паглядзім, што там.
***Ірына:*** Давай!

*(Адчыняюць.)*

***Ірына:*** Алесь! Дык тут схаваны сапраўдны скарб! Глянь сюды! Тут горкі саматканых дываноў, разнакаляровых, узорных. І ў ёлачку, і ў пчолку, і шырокіх, і вузенькіх *(паказвае)*.
***Алесь:*** А вось тут скручаныя роўненька настольнікі, ручнікі з найтанчэйшай пражы. Вось з ільнянымі карункамі, мяккія, бы шаўковыя *(паказвае)*.
***Ірына:*** А вось тут сурвэткі, нават ёсць і карціна *(паказвае)*.
***Алесь:*** Не проста так Кузьма нам сундук паставіў. Ён хоча, каб да прыходу гасцей мы ўпрыгожылі гэтымі рэчамі наш інтэр'ер.
***Ірына:*** Ах, хітрун, Кузя. Ведаў жа, што здагадаемся.
***Алесь:*** Давай, Ірына, створым прыгажосць.

*Ірына і Алесь засцілаюць посцілкі, настольнікі, вешаюць ручнікі, карціны, сурвэткі. Паяўляецца Хатнік так, каб яго не бачылі Ірына і Алесь і гаворыць гледачам:*
*- Я ведаў, што ўсё будзе спраўна. Бачыце, якія здагадлівыя дзеці. І якія моцныя ў*
іх повязі з продкамі, якая трывалая генетычная памяць. Яны захапіліся гэтай рукатворнай прыгажосцю і кожнай знойдуць сваё месца. А як жа інакш! Я памятую тых жанчын, якія стварылі гэтыя ўзоры. Ручнікі яны ткалі толькі ў пост, у той час, калі цела ачышчалася ад бруду, думкі напаўняліся дабром, паводзіны –

стрыманасцю, а душа вызвалялася ад будзённасці. А ўсё крыжыкі, ромбы, палоскі, елачкі, расліны – гэта свяшчэнныя веды, перададзеныя ад бабулі да ўнучкі. Ды што я зноў усё расказваю? Забыўся, што школа – гэта цэнтр культуры і прагрэсу. Камп’ютары, прынтары, сканары. Ух я яшчэ не зусім асвоіў. Таму папрашу Крысціну, каб яна вам расказала, якія знакі зашыфраваны ў вышытых узорах.

*(Дзяўчына расказвае, паказваецца прэзентацыя “Сімвалы вышыўкі”.)*

Нашы продкі – славяне лічылі, што галоўнымі багамі з’яляюцца светлае Сонца і Маці-Зямля-Карміцелька. Ад іх пайшло ўсё жыццё на зямлі.

*20 слайд.* Вобраз Сонца мае выгляд ромба з праменнямі ўбакі. Запаўненне ромба мае розныя варыянты.

*21 слайд.* Вобраз Зямлі-Карміцелькі набыў выгляд ромба, запоўненага маленькімі квадрацікамі ці ромбікамі. Гэта нібы зярняткі, роўна засеяныя на полі дбайнай рукой.

*22 слайд.* Вобраз Маці-Радзіцельніцы ў беларусаў карыстаўся асаблівай любоўю, таму, што ратавала народ ад пагібелі толькі здольнасць жанчын нараджаць. Таму і ўслаўлялі нашы продкі жанчыну-маці, упрыгожвалі яе сімваламі многія вырабы.

*23 слайд.* Вось гэта вышыўка – вобраз агню. Агонь звязваецца з домам, з сям’ёй. Агнём загадваў Жыжаль – “добры дзядзька”, які ўсіх адорыць: жанок – сярпамі, мужыкоў – лемяхамі, дзетак – цяплом сагрэе, выпаліць печы, каб старыя грэлі плечы. Вобраз Жыжаля ў ткацтве – гэта васьміканцовая разетка – зорка. Ад яе адыходзяць раслінныя ўзоры.

*24 слайд.* А вось гэты вышыты ўзор вобраз кахання. Пачатак кахання, першае знаёмства хлопца з дзяўчынай сімвалізуюць два галубы, павернутыя галовамі ў адзін бок, якія ідуць адзін за адным.

Калі птушкі павернуты галовамі адна да адной, а асабліва калі паміж імі букет кветак, - гэта сімвал кахання ў самым росквіце.

Калі ж птушкі павернуты галовамі ў розныя бакі – на жаль, каханне скончылася.

*25 слайд.* Сімвалам чалавека ў народнай свядомасці з’яўляецца зорка. Нарадзіўся чалавек – на небе з’явілася яго зорка. Зорка таксама сімвал славы, росквіту творчых сіл. Кажуць: “Зорка першай вялічыні, закацілася яго зорка”.

*26 слайд.* А гэта вобраз роднай Беларусі. Ён перадаецца ў выглядзе разеткі, аблямаванай гірляндай кветак.

*27 слайд.* Калі дзяўчаты вышывалі ўзоры, яны спявалі песні. Вось гэта вобраз песні. Песні і ўзоры суправаджалі беларускую сялянку на працягу ўсяго жыцця. Гэта яе самыя блізкія сябры, яе мары і спадзяванні.

*(28 слай. На прэзентацыі – выява лялек-абярэгаў.)* ***Крысціна:*** Ой, а гэта што? Кузя, ты зноў са сваімі жартачкамі? Што ты нарабіў? Ты ж сапсаваў мне прэзентацыю? Гэта ж не вышыўка!!!

***Хатнік:*** Бягу, бягу, Крысціна, табе на дапамогу. Я не сапсаваў, а дапоўніў. Ці ведаеш ты, што гэта за лялечкі?

***Крысціна:*** Не, не ведаю.

***Хатнік:***Гэта абярэгі. Яны з намі з даўніх часоў. Ёсць лялькі траўніцы, жаданніцы, падарожніцы.

*(29 слайд. На слайдзе лялька-абярэг любата.)* А вось гэтая лялька-абярэг “Любата”. Бачыш, Крысціна, гэта прыгожая дзяўчына з доўгай касой і паднятымі да сонца рукамі. Каса сімвалізуе здароўе, дабрабыт, прыгажосць і доўгае жыццё. Лепш за ўсё, калі каса напраўлена ўверх – да новых дасягненняў і новых поспехаў. А цяпер – сюрпрыз! Усім гасцям – абярэг “любата”.

*(Пад музычнае суправаджэнне дзеці дораць гасцям абярэгі.)*

***Хатнік:*** Паглядзіце, Ірына і Алесь ужо падрыхтаваліся да сустрэчы гасцей. Давайце паслухаем, што яны там гавораць.

*(Хатнік хаваецца)*

***Ірына:*** Ох, Алесь, як тут пасвятлела і папрыгажэла.

***Алесь:*** Сапраўды, Ірынка, нібы здарыўся цуд. Гляджу і думаю, што ўсе гэтыя рэчы па мастацкіх якасцях можна паставіць у адзін рад з фрэскамі егіпецкіх перамід.

***Ірына:*** Так, Алесь, так. Толькі ручнікі, посцілкі, сурвэткі нам значна даражэйшыя, бо ў іх душа нашага народа, цеплыня яго рук, разуменне хараства прыроды і злучанасці з Сусветам.

***Алесь:*** З гэтым нельга не пагадзіцца. Але прыслухайся, Ірына. Здаецца, на двары шум. Напэўна, гэта нашы дзеці сустрэлі гасцей і запрасілі іх у школу.

***Ірына:*** Давай і мы пойдзем іх.

***Хатнік:*** Можна, і я з вамі пайду?

***Алесь:*** А вось і Кузьма знайшоўся. Канечне, можна, пойдзем усе разам.

*(30 слайд. Пад музычнае суправаджэнне заходзяць жанчыны і дзеці.)*

***Алесь:*** Добры дзень!

***Ірына:*** Вітаем вас у нашай школе!

***Алесь:*** Нашы вам шанаванні! Праходзьце, калі ласка! Сядайце. Будзьце як дома.

*(Пад музычнае суправаджэнне дзеці і госці займаюць свае месцы.)*

***Ілья:*** Жанчына… Гэта і цяпло дамашняга ачага, і ціхая радасць мацярынства, і пяшчотны дотык рук. Гэта і вернасць, і годнасць, і шчасце.

*(На экране – 31слайд-застаўка.)*

***Таня:*** З жанчыны пачынаецца ўсё лепшае: і цеплыня душы, і цярпенне, і любоў, і дараванне, і спачуванне, і натхненне. З жанчыны пачынаецца Радзіма.

***Наташа:*** Жывеш не для славы і чынаў,
Жывеш на зямлі для людзей.
Ты проста завешся – жанчына,
І шлях твой удалеч вядзе.
Там будуць і радасць і слёзы,
Нявернасць і здрада сяброў.
Панікнуць пачуцці, як лозы, -
Ды будзеш адказваць дабром.
Так многа няпраўды на свеце –
Табе сваю праўду нясці.
Прытуляцца блізенька дзеці,
Хоць цяжка, а трэба ісці.
Бо ты – і жанчына, і маці.
Твой келіх душы –
Да краёў.
Як светла,

Як цёпла ў хаце,
Дзе сэрца пылае тваё.

***Ілья:*** І сапраўды, жанчына прыгожая сваёй самаахвярнасцю. А яшчэ працаватасцю, натхненнем, паэтычнасцю.

***Таня:***Паважаныя сябры! Да сябе ў госці мы запрасілі самых таленавітых, самых жыццелюбівых і самых натхненых жанчын.

***Ілья:*** Да нас завіталі Тамара Данілаўна і Валянціна Мікалаеўна. Гэта жанчыны, якія берагуць і песцяць матчыну песню.

***Таня:***Алена Пятроўна – умелая кулінарка. Яна надта смачна гатуе розныя стравы.

***Ілья:*** А Таццяна Віктараўна – наша знакамітая мастачка. З яе карцінамі можна пазнаёміцца на выставе на другім паверсе.

*(Дзеці задаюць гасцям пытанні і слухаюць іх адказы.)*

***Таня:***Таццяна Віктараўна, першыя нашы пытанні да вас. Мы знаёмыя з вашымі карцінамі. Яны частыя госці на нашых школьных выставах, мы бываем у вас дома – там іх бачым. А вось хочацца ведаць, з чаго ж пачалася ваша творчасць. Што паслужыла штуршком для стварэння такіх шэдэўраў? *(Адказ.)*

***Саша:*** А ці памятаеце вы, што было адлюстравана на вашай першай карціне? І як даўно гэта было.

***Даніла:*** Таццяна Віктараўна, ці ёсць у вас карціны, дзе адлюстраваны не нашы краявіды, а якія небудзь заморскія краіны? Калі не, то чаму? *(Адказ.)*

***Оля:*** Скажыце, калі ласка, а хто з'яўляецца вашымі першымі гледачамі і як яны ставяцца да створаных вамі карцін: крытыкуюць, хваляць або застаюцца раўнадушнымі? *(Адказ.)*

***Наташа:*** Раскажыце нам, калі ласка, як праходзіць працэс стварэння карціны ад задумы да яе рэалізацыі? *(Адказ.)*

***Таня:*** Таццяна Віктараўна, ваш сын Ігар падрыхтаваў для вас падарунак – прэзентацыю вашых карцін. Ён хоча яе паказаць гасцям і прачытаць для вас верш.

*(Паказваюцца слайды прэзентацыі 32-43, на якіх змешчаны фотаздымкі карцін Таццяны Віктараўны Дубніцкай. Ігар чытае верш, слайды змяняюцца па чарзе.)*

***Ігар:*** Кажуць, Марачкін мастак.
Гэта праўда, гэта так.
Для мяне ж мастачка маці.
Сто карцін ў нашай хаце.
Вось лебедзі дружна ў пары плывуць,
Півоні так хораша, ярка цвітуць.
І восень у кошычак фарбы сабрала,
А сонца прамені свае раскідала.
Чуеце, госці, вадзіца спявае,
А лістапад нас красой ахінае.
Сланечнікі і астра душу мне хвалюе.
Як мамка мая, так ніхто не малюе.
Вось гляньце, на ўзлеску казулі стаяць,
А лес… ну такі, што аблок не відаць.
І сад я вось гэты вельмі люблю,
А мамку сваю я люблю і цаню.

***Іра:*** Дзякуем вам, Таццяна Віктараўна. Гэта сапраўдныя шэдэўры. Нясіце і надалей у свет прыгажосць, шчодра дзяліцеся сваім талентам з людзьмі. І няхай ніколі не пакідае вас натхненне.

*(44 слайд-застаўка.)*

*Саша мацае шарачок Кузьмы.*

***Саша:*** Кузьма! Кузьма!

***Таня:*** Саша, што ты хочаш запытацца ў Кузьмы?

***Саша:*** Я даўно хачу запытацца ў Кузі, з чаго зроблены яго шарачок.

***Хатнік:***А што, чужое дабро бярэ за рабро?

***Саша:***Ды не, проста цікава.

***Хатнік:***Ты, можа, мой шарачок украсці хочаш? Помні, Саша, хто пачынае красці з іголкі, той дойдзе да кароўкі.

***Саша:***Кузьма, у цябе язык: сем разоў апераза́ўся і яшчэ канец застаўся.

***Хатнік:***А што ты думаў, брахаць – не цэпам махаць.

***Саша:***Дык усё-такі з чаго твой шарачок?

***Хатнік:***З сукна.

***Саша:***А сукно з чаго?

***Хатнік:***З воўны.

***Саша:***А воўну хто даў?

***Хатнік:***Авечкі.

***Саша:***Дык якая жывёліна дала табе гэты шарачок?

***Хатнік:***Бацька…

***Таня:*** Хлопцы, хопіць жартаваць. Давайце працягнем гаворку. Мы хочам пагутарыць з Тамарай Данілаўнай і Валянцінай Мікалаеўнай. Мы ведаем, вы жывяце ў розных вёсках, але сябруеце ўжо доўгі час. Нам хочацца з вамі пагаварыць, паслухаць вашыя песні, але найперш прачытаць пра вас верш.

***Саша:*** Тамару Данілаўну і Валянціну Мікалаеўну нават і прадстаўляць не трэба,

Бо вядома: дзе бяседа –
Там ліецца іхня песня
Летам, увосень, напрадвесні.
З песняй журацца і тужаць,
З песняй у танцы яны кружаць,
З песняй жнуць, у гародзе поляць
І кароўку з песняй дояць.
І так песня тая льецца,
Што кранае душу, сэрца.

***Маша:*** Тамара Данілаўна, скажыце, а вы, напэўна, спяваеце з дзяцінства? *(Адказ.)*

***Маша:*** Валянціна Мікалаеўна, а хто вас навучыў спяваць? *(Адказ.)*

***Алесь:*** Тамара Данілаўна, а вам якія песні больш падабаюцца? Да якіх ляжыць душа? *(Адказ.)*

***Таня:*** Зараз доўжыцца святкаванне Вялікадня. Можа, вы праспявалі б для нас песню, звязаную з гэтым святам.

*(Спяваюць “Хрыстос”.)*

***Ілья:*** Дзякуем вам за такую цудоўную песню.

***Даніла:*** А я ж таксама ведаю, як бавілі час, калі збіралася моладзь. Мне бабуля расказвала. Акрамя таго, што танчылі, спявалі, гулялі ў розныя гульні, яшчэ расказвалі ўсялякія гісторыі. Я таксама ведаю адну. Слухайце.

*(Расказвае.)*

Пайшоў адзін чалавек у лес трэсці жалуды. Узабраўся на высокі дуб, на самую верхавіну. У гэты час усхапіўся вялікі вецер. Калі вецер раскачаў дуба з чалавекам, чалавек гаворыць: “Госпадзі, спыні вецер. Пастаўлю ў царкве самую большую свечку”.

У гэты час вецер сціх. Чалавек пачаў скарэй злазіць. Стаў на ніжняй сухой галіне і дзяржаўся за сухую галіну. А сам падумаў: “А як не пастаўлю свечку, дык што будзе?” У гэты час галіна абламалася, і чалавек упаў на зямлю. Калі ачухаўся, то кажа: “Вот які ты нецярплівы, Госпадзі, а можа б, я і паставіў”.

***Іра:*** Дзякуем табе за гумар, Даніла. А я зноў звяртаюся да Тамары Данілаўны. Тамара Данілаўна, а якія танцы вы танцавалі ў маладосці? І пад якую музыку? *(Адказ.)*

***Ілья:*** А зараз паглядзіце, калі ласка, як танчаць нашы дзеці.

*( Выконваецца танец “Полька”.)*

***Таня:*** Алена Пятроўна, неяк раз мы чулі размову вашых сыноў. Праўда, гэта было даўнавата, але яна нам запомнілася надоўга. Нашы сябры паспрабуюць яе ўзднавіць.

***Сяргей:***Ведаеце, хлопцы, люблю я жыць ну толькі дома.

***Саша:*** Эх, Ваня, дык гэта ж кожнаму вядома.

***Даніла:*** Цеплыня тут і камфорт,

***Сяргей:***А на свята – пышны торт.

***Саша:*** Шакалад, бісквіт, пячэнне

***Даніла:*** І вішнёвае варэнне.

***Сяргей:***Усё згатуе наша мама:

***Саша:*** Суп, катлеты, блін таксама.

***Даніла:*** І няма зусім сакрэту:

***Сяргей:***Гаспадыні лепшай нету.

***Саша:*** Толькі думаю падчас,
Застанецца што ад нас,
Калі пойдзем мы служыць?
Будуць нас там так карміць?

***Даніла:*** Пэўна не-е-е!

***Сяргей:***Дык вось што, братцы,
Тут за справу трэба ўзяцца:
Разузнаць, хто повар там,
І прывесці яго к нам.

***Саша:*** Хай навучыцца варыць,
Тады пойдзем мы служыць,

***Усе:*** Бо без мамінай яды
Нас не возьмеш нікуды.

***Таня:*** Вось так гаварылі пра маміны кулінарныя здольнасці вашы сыны. Ды і мы ведаем, што вы майстар сваёй справы. Алена Пятроўна, адкрыйце сакрэт, хто навучыў вас так смачна гатаваць разнастайныя стравы.

***Маша:*** А якія стравы вы помніце з дзяцінства, што гатавала для вас маці? *(Адказ.)*

***Саша:*** Я гляджу. Вы да нас з пачастункамі? *(Адказ.)* Раскажыце пра іх. *(Аповед.)*

***Алена Пятроўна:*** Так, дзеткі, з пачастункамі. Як бачыце, гэта хлеб, булка, торт. Як вы лічаце, што з іх самае важнае для чалавека?

***Дзеці:*** Хлеб!
***Алена Пятроўна:*** Так, канечне, хлеб. Я спякла яго ў сучаснай хлебапечцы, а раней яго выпякалі ў цаглянай печы. Печ заўсёды фарбавалі ў белы колер. Яна была галоўным месцам у хаце, сімвалам жыцця. Хлеб выпякалі з квашанага цеста. Гэта была вельмі адказная справа. Гаспадыня з вечара рашчыняла хлеб – разводзіла цёплай вадой у дубовай дзяжы закваску (трошкі цеста, пакінутага з папярэдняга разу), ставіла ў цёплае месца, а раніцай дасыпала мукі і добра вымешвала цеста. Звычайна хлеб пяклі раз на тыдзень – 5-8 вялікіх боханаў. Хлеб саджалі ў печ драўлянай лапатай, папярэдне паклаўшы на яе кляновае, дубовае, капуснае лісце, лісце хрэну. Кожны бохан акуратна ссоўвалі разам з лісцем на ачышчаную чэрань і засланялі печ. Існавала шмат звычаяў, звязаных з выпяканнем хлеба: гаспадыня павінна быць чыста апранутая і ў добрым настроі (інакш хлеб будзе нясмачны); забаранялася, пакуль хлеб у печы, гучна размаўляць, смяяцца, ляжаць на печы, бо ўсё гэта – крыўда для хлеба, знявага, ён можа патрэскацца, выйсці няўдалым. Дастаўшы хлеб з печы, клалі яго на ручнік, пырскалі бохана вадой, каб скарынка была мякчэйшая. Хату напаўняў найлепшы водар – хлебны пах…
***Крысціна:*** Алена Пятроўна, я ведаю такі цудоўны верш пра хлеб. А можна, я яго прачытаю.
***Алена Пятроўна:*** Канечне можна. Слухаем.

Нібыта ў жыце перапёлка,
Устрапянулася душа.
П'ю хлебны пах. Ён лепш за зёлкі,
Лепш сырадою з гладыша.
Ля печы маці б'е паклоны,
І кожны з іх, як адкрыццё.
На залатых далонях клёна
Ляжаць не бохана – жыццё.
І так захочацца – аж слінкі –
Акрайчык адламаць цішком
Ад той пахучае скарынкі,
Што млее там, пад ручніком.
Як светла стала ў нашай хаце,
Аж вокны зіхацяць яе.
У сенцы хлеб выносіць маці –
Яму пашану аддае…

*Сяргей Законнікаў*

***Алена Пятроўна:*** Слаўны верш. Малайчына Крысцінка. Ты яго вельмі выразна прачытала. Дзякую табе. Што ж, буду расказваць далей.

Грахом было скідаць на падлогу крошкі (іх абавязкова збіралі са стала, і калі самі не елі, то аддавалі птушкам). Нельга было казаць пра ежу дрэнныя, абразлівыя словы, каб не пакараў Бог і сям'я не засталася без хлеба.

Пасля ежы неабходна было абавязкова выказаць падзяку Нябёсам і прыбраць посуд, інакш уначы там "наладзіць" сабе стол нячыстая сіла.
***Хатнік:*** Праўду кажаце, Алена Пятроўна, усё так і было. А яшчэ хачу дабавіць, што хлеб смачны і сыты, калі сваі мазалём здабыты. Калі ёсць хлеб – жыве чалавек. Нездарма ж кажуць: "Будзе хлеб – будзе і песня".

Тамара Данілаўна, Валянціна Мікалаеўна, ці не паспявалі б вы нам яшчэ адну песню.

*(Гучыць купальская песня “Чыжык”.)*

***Наташа***: Сапраўды, слаўна гучыць наша песня. Аж душа разам з ёй спявае.

Застаюцца песня і Радзіма.
Можа ўсё мінаць, але яны,
Непадзельныя, не знікнуць з дымам
Восені, кахання ці вясны.
І няхай жыццё не вельмі песціць
Тых, каму Айчыны боль баліць,
Ёсць радзіма – значыць, будзе песня,
Будзе песня – і Радзіме жыць!

Н.Гальпяровіч

***Саша:*** Але ж вернемся да пачастункаў. Так цікава расказвае Алена Пятроўна. Напэўна, усім захацелася ведаць рэцэпт гэтай булкі. Алена Пятроўна, падзялілася з намі, калі ласка.

***Алена Пятроўна:*** Ну, слухайце. Гэта булка велікодная. А рэцэпт прыгатавання просты. Узяла я муку, малако, цукар, яйкі, разынкі, дрожджы, крыху пасаліла чацвярговай соллю, замясіла цеста і выпякала ў пятніцу. І раней таксама булкі пяклі ў перадвелікодную пятніцу.

А ці ведаеце вы што такое чацвярговая соль? Не? Тады я вам раскажу. Перад Вялікаднем, уноч з серады на чацвер, усе члены сям’і пакрыху насыпалі солі ў місачку і ставілі яе на вуліцу, пад зоркі. Лічылася, што чацвярговая соль мела выключныя магчымасці: выкарыстоўвалася як магічны лекавы сродак для лячэння людзей і хатняй жывёлы, служыла наймацнейшым абярэгам на працягу ўсяго года. А вось пячы хлеб і чысціць у печы ў Чысты чацвер забаранялася. Трэба было сеяць капусту і перабіраць для пасадкі цыбулю.

***Хатнік:*** А яшчэ ў Чысты чацвер нельга было гасіць агонь вадою, бо грэх жыццё яму адбіраць, так як гэты дзень і для агню важны.

***Алена Пятроўна:*** А вось у пятніцу яшчэ фарбавала яйкі, гатавала святочныя стравы. Вось прынесла вам па чырвоненькім яечку

(*Ставіць на стол кошычак з яйкамі.)*.

Дзеці, а што вы зрабілі з шалупіннем ад першага з’едзенага на Вялікдзень яйка ( а яно было свянцонае, бо ім, соллю і асвечанымі стравамі разгаўлялася сям’я)? *(Адказы дзяцей.)*

***Алена Пятроўна.*** А раней яго захоўвалі ў доме. Лічылася, што яно ахоўвае ад маланак і пажараў. Астатняе шалупінне ад звараных на Вялікдзень яей таксама не выкідвалі, а закопвалі ў полі і на агародзе, падмешвалі ў насенне.

***Хатнік:***Даруйце, Алена Пятроўна, але так хочацца яшчэ дапоўніць. Асвечанае чырвонае яйка кідалі ў ваду, і ўся сям’я мыла ў гэтай вадзе рукі і твар, каб быць прыгожым і здаровым цэлы год.

***Алена Пятроўна:*** Дзякую табе, Кузьма, што дапамог мне, дапоўніў мой аповед. Ну, а вось гэта – сучасны торт. Гэта вам пачастунак.

***Таня:*** Дзякуем вам, Алена Пятроўна, за такую цікавую размову. Жадаем, каб вашы рукі стваралі не толькі прыгожую, але і заўсёды смачную страву. Такую, як у гэтым вершы.

Вось ты ў гасцях – і нават слоўца

Табе сказаць няма калі:
Вяндлінку з водарам ядлоўца
Мяцеш – зараз па два скрылі!
А побач – зірк! – як цуд, як казка –
З каляндрай, з перцам, з часнаком –
Ляжыць вясновая каўбаска,
Таксама ўвітая дымком!
К таму ж падсохла на гарышчы –
Дык толькі плеўка шапаціць!
Умэнт кальцо з паўметра знішчыў –
Адно раз'ятрыў апетыт!
Калі ж дапяў да вантрабянкі –
Цягаць стамілася рука!
Глядзіш – а ўжо кіндзюк крывянкі
На блюда выклалі з гаршка!
Паспеў адчуць, што ўжо не слабка
І ў паясніцы, – а на стол
Тым часам едзе ў місе бабка
І парай дыхае пад столь:
З бакоў запечана щ меру,
І ў бульбе скварачкі тырчаць… -
І так жа ўслед пайшла на змену –
Хоць замычы, каб не маўчаць!
"Усё! – сказаў. – На гэтым дзякуй!"
А на абрус – нясуць бліны
І к ім – мачанку-верашчаку
З наборам рэбрачак свіных!
Хвіліну выстагнаў ты моўчкі:
"Дзе месца ўзяць? Патоўпіць дзе?"
І неўпрыкмет на два-тры вочкі
Паслабіў пас на жываце…
Ужо не здыхацца! Падпёрла –
Няйначай крушня камянёў!..
А перад носам… ставяць цёрла
Гарачых, тлустых калдуноў!
Калдун! Духмяны, самавіты
У масле ўсмяглы, а паўзверх –
Смятанай свежаю паліты!..
Ну, што? Ізноў глядзіш, як звер?
- І адчуваш, адчуваеш:
Няхай хоць згэтуль у труну –
А не зганьбуеш, не стрываеш –
Дасі прытул і калдуну!
Калі на свеце нехта дзесьці
Умее добра працаваць, -
То ўмее ён і смачна з'есці
І – адпаведна – згатаваць.

*Н.Гілевіч*

***Хатнік:*** Слухайце, ну і плячысты быў на жывот герой гэтага верша. Але ж еў не адзін, а ў гасцях. А ў народзе кажуць: “Адзін з’ем хоць вала – адна хвала, а як станеш з людзьмі есць – будзеш мець чэсць”. Сапраўды, чэсць таму чалавеку, хто сярод людзей.

*(Дзеці выходзяць, строяцца на сцэне.)*

***Ірына:*** Згодна з табою, Кузьма. І мы сягоння маем за чэсць прымаць у сябе такіх цудоўных жанчын. Паважаныя госці, прыміце шчырыя словы падзякі за тое, што вы далучылі нас да хараства і прыгажосці.

***Алесь:*** Тварэннем сваіх рук і душы вы захапляеце, здзіўляеце, бераце ў палон. Ні адзін не застанецца раўнадушным, дакрануўшыся сэрцам да вытокаў хараства, створанага жанчынай.

***Ірына:***Жанчыны вёсак беларускіх,
Я кланяюся вам уклонам самым нізкім
За кожную іскрынку хараства,
Што ззяе ў творах ад калыскі блізкіх. *(Н.Гілевіч)*
***Алесь:*** З удзячнасцю і шчырасцю паклон.
Ён тым, хто славен працаю здавён –
Жанчынам, хараством душы багатым,
Ён вам, хто сатварыў нам сёння свята.
***Ірына:***Жанчыны! Вы сагрэлі сабою прастор
Ад траў, што ў росах, да ясненькіх зор.
Вы – талент, вы – праца, і вы – дабрыня,
І мудрасць, і ласка, і вышыня.
***Алесь:*** Дык дай жа Божа,
Каб вам было гожа,
***Даніла:*** Весела жылося, *(Тут і далей апошняе слова пажадання дзеці прамаўляюць разам.)*
***Маша:*** Шчасліва вялося:
***Ілья:***У полі ўродзіста,
***Наташа:***У гумне намеліста,
***Сяргей:*** У млыне нямаліста,
***Таня:*** У дзяжы падыходзіста,
***Ігар:*** У асеці накладзіста,
***Оля:*** У таку ўмалоціста,
***Саша:*** У арудзе насыпіста,
***Наташа:*** На стале ўедзіста.

***Маша:***Паважаныя госці, у знак удзячнасці прыміце ад нас кветкі і ў падарунак песню.

*(Дзеці дораць жанчынам кветкі. Гучыць песня “Мы вам жадаем”*

Трэба прызнаць, трэба сказаць
Рады былі вас прывітаць.
І з пачуццём гуртам спяём
Тое, што хочам вам пажадаць.

*Прыпеў:*
Мы вам жадаем, каб да вашых хат

Сцежкі не ведаў ні ўрач, ні адвакат
І каб было вам на ўсім вяку
Лёгка на сэрцы, цяжка ў кашальку.

Верым мы зноў, як у сяброў
Будзе сустрэч нямала ў нас
І ў добры час толькі для вас
Мы праспяваем яшчэ не раз.

*Прыпеў.*

*(На фоне слоў вядучых паказваюцца слайды прэзентацыі 45-48 са старымі фотаздымкамі.)*

***Маша:*** Дык хіба дарэмна ішлі тыя, першыя?
***Арцём:*** І хаця іх імёны і вобразы сцерліся – што з таго?
***Маша:*** Вось крочым цяпер мы, успамінаем і ўдзячныя назаўсёды ім, першым.
***Арцём:*** Зерне, кінутае імі, узрастае. Дык давайце і мы будзем сейбітамі.

*(На фоне верша паказваецца 49 слайд з фотаздымкамі ўрокаў і выхаваўчых мерапрыемстваў.)*

Годзе ныць:
“Загіне Айчына!..”
Лепш з сябе пачынай
Без прынукаў:
Навучы роднай мове
Сына!
Навучы роднай мове
Унука!
І тады
Стане поле каласіцца,
Ляжа шоўкавым абрусам,
Будзем сеяць, беларусы!
Закрасуе буйна збожжа.

*(На фоне верша паказваецца слайд 50.)*

***Іра:*** Любоў мая невылечная,
Чалавечая, пастаянная.
Стрыж над змялелай рэчкаю,
Чмель на сухім святаянніку.
***Алесь:*** Колькі лёсам адведзена
Мне хадзіць тут і бавіцца,
Мне на іх не наглядзецца,
Мне ад іх не пазбавіцца.
***Іра:*** Я з малітвай адзінаю
Да Ўсявышняга грукаю: (*паказваецца заключны слайд 51.)*
Хай маё стане сынавым
І хай сынава будзе ўнукавым.

*А.Пісьмянкоў*

*(Гучыць песня “Ой, сівы конь”, якая паступова заціхае.)*
*Пад музычнае суправаджэнне дзеці разам з гасцямі выходзяць з залы.*

# Фальклорнае свята для навучэнцаў 7-10 класаў

## *«Лёс жанчыны – зараснік шыпшыны»*

**Мэты:** садзейнічаць узбагачэнню ведаў вучняў пра беларускія народныя песні; паказаць адметнасць песень у выяўленні душы жанчыны; выхоўваць цікавасць і любоў да беларускай народнай песні.

**Эпіграфы:**

1)Песня народа - гэта сапраўдная чалавечая душа (Рыгор Шырма).

2)Ад мама песня: памятка і спадчына (Ніл Гілевіч).

**Ход мерапрыемства**

*Гучыць «Канцэрт для цымбал і народнага аркестра».*

***Першы чытальнік*** (*пад музыку выконвае верш Р. Барадуліна «Ад сівых гадоў»).*

Ад сівых гадоў,
ад дзядоў
Для мяне
ашчаджона спадчына:
Песні жніўнай
смутак удоў,
Мох зязюльчын,
гняздо курапатчына;
Сіні верас
і сіні дым,
Зоркі першай
драбнюткая мачына,
Яры хмель
над ярам крутым,
Галубіная мова матчына.

***Настаўнік.*** Пра спадчыну чалавек думаў спакон веку. Апрацоўваў зямлю, даглядаў жывёлу, будаваўся, гадаваў і выхоўваў дзяцей, ладзіў святы, весяліўся або смуткаваў — пастаянна думаў, турбаваўся: а што ён перадасць у спадчыну? Хацеў, каб яго дзеці былі шчаслівейшыя, чым ён, і таму стараўся пакінуць ім як мага больш: і тое, што стварылі рукі, і тое, што напрацавала душа. На жаль, сёння многія з беларусаў не ведаюць ні абрадаў, ні звычаяў, ні народных песень...

***Другі чытальнік*** *(выконвае верш Н. Гілевіча «Адкажы!» ).*

Брат мой! братка мой! братачка родны!
Адкажы — сам сабе адкажы:
Чым зрабіўся табе непрыгодны
Скарб бясцэнны тваёй жа душы?
Ад чаго так бяздумна, бязмоўна
Ты яго выракаешся сам?
І чаму табе так усё роўна,
Што аборай становіцца храм?
Ці таму, што калісьці падступна
Растапталі твой шчыры давер?
Што на ніве, дзе сеяў ты рупна,
Вытраўляліся ўсходы твае?

Што ў стагоддзях варожыя збродні
Распіналі твой лёс на крыжы?
Брат мой, братка мой, братачка родны,
Адкажы — сам сабе адкажы!
Жыў ты ў горы, змагаўся ў няволі,
І канаў, і сыходзіў крывёй,
І жывым ты гарэў, а ніколі
Не саромеўся мовы сваёй.
Схамяніся ж, ачніся, агледзься!
Ды разваж, ды раздумай як след:
Што пакінеш ты з поля ў налецце?
З чым нашчадкі пакажуцца ў свет?

***Настаўнік.*** Каб адказаць на пытанне, што мы пакінем нашчадкам нашым, трэба добра ведаць, якая спадчына дасталася нам з мінулага, з вякоў, ад продкаў.

***Трэці чытальнік*** *(выконвае верш Н. Гілевіча «Твае балючыя навек мелодыі...» ).*

Твае балючыя навек мелодыі,
Што выварочваюць табе душу,
Душой дзяцей тваіх не завалодалі –
Скрыгочуць рытмы дзікія ўвушшу.
Заносяць сэрцы, як пяскі бясплодныя.
І страшна мне падумаць — не хлушу:
Няўжо не дойдуць да дзяцей мелодыі,
Што выварочваюць табе душу?

***Настаўнік.*** Сённяшняе свята ладзіцца дзеля таго, каб народныя мелодыі завалодалі нашымі сэрцамі. Яно, спадзяюся, дасць магчымасць адчуць, наколькі багаты, таленавіты, мудры наш народ у песнях.

У нас у гасцях... *(прадстаўленне гасцей, кароткае знаёмства з іх біяграфіяй).*

Госці згадзіліся пазнаёміць нас з тым скарбам, якім яны валодаюць, — з беларускай народнай песняй нашай мясцовасці. Мы пачуем тое, што спявалася калісьці ў нашых вёсках, прасочым, як адлюстраваўся ў іх лёс жанчыны: яе нараджэнне, каханне, замужжа і сямейнае жыццё.

Пачнём знаёмства з хрэсьбіннымі песнямі:

А ў бары сасна калыхалася,
А там куманька прыбіралася,
Трыма мыламі ўмывалася.

***Першы вучань*** (*апавядае пра хрэсьбінныя песні).* Хрэсьбінныя песні суправаджалі абрады, якія выконваліся ў сям'і ў сувязі з нараджэннем дзіцяці. Радасць сямейнага свята і складае асноўны змест хрэсьбінных песень.

Радзінныя песні прысвячаліся нованароджанаму, маці-парадзісе, бацьку, бабцы-павітусе, куму і куме. Многія з іх можна назваць велічальнымі, таму што вылучаюць з грамады пэўнага ўдзельніка святкавання, выказваюць яму павагу і пахвалу, падкрэсліваюць яго заслугі. У той жа час у многіх хрэсьбінных песнях, асабліва адрасаваных бабцы-павітусе, куму, куме, вобразы апошніх як бы наўмысна прыніжаны ўвядзеннем дабрадушна-жартаўлівых гумарыстычных нотак. На хрэсьбінах спяваліся таксама песні, якія не маюць непасрэдных адносін да свята ў

гонар нараджэння чалавека. Па змесце і па характары сваім гэтыя песні хутчэй бяседныя, якія маглі гучаць у любым святочным застоллі.

***Чацвёрты чытальнік*** (*выконвае верш Н. Гілевіча «Жанчыны вёсак беларускіх»).*

Жанчыны вёсак беларускіх, вам
Я кланяюся ўклонам самым нізкім —
За кожную іскрынку хараства,
Што ззяе ў слове, ад калыскі блізкім.
Пачуеш вас, не зманеных маной, —
І весялей глядзіш у твар эпохі.
Дык пасядзіце ж, любыя, са мной,
Пагаманіце, пагукайце трохі...

***Настаўнік.*** Настала чарга даць слова нашым гасцям. Яны праспяваюць хрэсьбінную песню.

*Гучыць песня*(тут і далей гучаць песні, якія спяваюцца ў пэўнай мясцовасці).*

***Настаўнік.*** Ніводнае свята не абыходзілася без музыкі. Давайце і мы паслухаем, як гучалі нашы цымбалы, калі весяліўся беларус.

*Вучань выконвае на цымбалах «Польку».*

***Настаўнік.***

А дзе ж тая крынічанька,
Што голуб купаўся?
А дзе ж тая дзяўчынанька,
Што з ёю кахаўся?

У няпісанай і нікім да канца не прачытанай кнізе народнай паэзіі лірыка кахання — адна з самых прыгожых, самых светлых і самых пяшчотных старонак. Мінаюць і аддаляюцца дзесяцігоддзі, чалавецтва дасягнула новых вышынь у навукова-тэхнічным развіцці, а складзеныя сто, а можа, і дзвесце год назад простыя радкі пра каханне не старэюць, не трацяць актуальнасці і патрапляюць сваім эмацыянальным ладам і настроем адгукнуцца на самыя патаемныя зрухі ў душы сучаснага чалавека. І ён, гэты чалавек касмічнай эпохі, застаючыся сам-насам са сваім сардэчным клопатам, гэтак жа, як і сто гадоў назад яго прапрадзед, горача і пяшчотна кліча:

— Выйдзі, дзяўчыначка, выйдзі, рыбчына,
Пагаворым мы з табой.

***Другі вучань.*** Створаныя народам вобразы закаханых поўныя чалавечай прывабнасці і паэтычнага хараства. Абаяльны вобраз маладой дзяўчыны, бясконца шчырай, даверлівай і самаахвярнай у сваіх пачуццях. Вернасць у каханні для яе даражэй за ўсё на свеце.

Вернасць — гэта зорка шчасця. Паэтызуючы каханне як самае прыгожае і высакароднае пачуццё, народная песня ў той жа час бязлітасна асуджае здраду і ашуканства ў адносінах паміж закаханымі.

***Настаўнік.*** Паслухайце народную песню пра каханне.

*Гучыць песня.*

Калі б у беларускім песенным фальклоры не было нічога іншага, апрача вясельных песень, і тады былі б усе падставы сказаць, што ён адносіцца да самых багатых у свеце. Гэта — не перабольшванне. Песень, што калісьці спяваліся на беларускім вяселлі, — безліч. Шлюб для працоўнага чалавека быў найвялікшым

асабістым святам, самым высокім і ўрачыстым момантам, які магло яму падарыць жыццё. Вяселле давала магчымасць чалавеку не толькі выказаць у песнях пажаданні здароўя, багацця і шчаслівай долі маладым, не толькі засведчыць сваю павагу і пашану да родзічаў, сваякоў і суседзяў, але і сказаць шмат чаго іншага, чым жыла, цешылася і пакутавала яго душа.

***Трэці вучань.*** Вясельныя песні спяваліся на розных этапах вясельнага рытуалу: сватанне, запоіны, выпяканне караваю, дзявочы вечар, пасад з пастрыганнем і баслаўленнем маладых бацькамі, вянец, пераезд маладой у дом маладога, пярэзвы.

На кожным этапе спяваліся адпаведныя песні, якія мелі свой адметны змест і характар. Беларуская вясельная лірыка вызначаецца багатай і высакароднай змястоўнасцю, глыбокай эмацыянальнасцю і чароўнай паэтычнасцю.

Знаёмства з ёй можа даць нямала душы сучаснага маладога чалавека. Сумныя, тужлівыя песні аб горкім, нешчаслівым замужжы прымусяць глыбей задумацца над жыццём і лёсам сваіх дзядоў, прадзедаў і ясней, выразней убачыць сваё жыццё, свой лёс. Яны пакідаюць у душы водсвет незвычайнай маральнай чысціні і цнатлівасці — тое, чым сёння і заўсёды павінен даражыць малады чалавек, уступаючы ў шлюб, паядноўваючы свой лёс з лёсам іншага.

***Настаўнік.*** А цяпер у выкананні нашых гасцей прагучыць вясельная песня. Яе можна было пачуць пры сустрэчы маладых.

*Гучыць песня.*

***Настаўнік.*** Беларускія вясельныя песні вылучаюцца сярод песенных жанраў абрадавай паэзіі спалучэннем сапраўднага драматызму з глыбокай лірычнасцю. Гэта і зразумела. Шлюб быў найважнейшым пераломным момантам у жыцці жанчыны. Усё яе жыццё падзялялася на дзве рэзка не падобныя між сабой палавіны: да замужжа і замужам. Мацнейшага эмацыянальнага перажывання, чым у дні вяселля, яна не ведала. Увесь жа лёс, усё жыццё залежала ад таго, якім — шчаслівым ці нешчаслівым — акажацца замужжа. У вясельных песнях раскрываецца высакародная, чыстая, неразбэшчаная душа чалавека працы. У сукупнасці сваёй гэтыя творы — вялікая і светлая песня Чалавечнасці, песня Каханню і Пяшчоце, песня вечнаму імкненню людзей да шчасця. І яе не азмрочваюць зразумелыя матывы тугі і смутку, выкліканыя развітаннем нявесты з «дзявоччынай», з «пагуляннейкам» у дзявочай волі, з сяброўкамі і родным домам. Колькі глыбокага хвалявання, трывогі, шчырай даверлівасці ў душы маладой! І колькі ва ўсім гэтым сапраўднай чалавечай годнасці! Як сур'ёзна, з якой адказнасцю звязвае яна сваё жыццё з жыццём іншага чалавека. Хіба пра гэта не карысна ведаць і ў нашы дні, калі нямала маладых людзей глядзяць на ўступленне ў шлюб як на прыемную забаву, зусім не думаючы пра яго вынікі, пра абавязкі сямейнага чалавека.

***Чацвёрты вучань.*** У беларускіх вясельных песнях вельмі глыбока раскрыта павага і любасць дарослых дзяцей да маці і бацькі. Асабліва — у песнях сіроцкіх, поўных жалю і смутку, поўных горкага ўсведамлення: якое гэта вялікае няшчасце — страціць бацькоў, самых родных і блізкіх табе людзей. І справа не толькі ў тым, што нявестку-сіраціну звычайна чакала ў замужжы гарчэйшая доля, чым нявестку пры бацьку і маці. Справа яшчэ і ў глыбока чалавечым пачуцці шкадавання, у моцнай духоўнай сувязі з бацькамі, у натуральным перакананні, што іншыя адносіны да бацькоў — амаральныя, а таму ганебныя. Адвечныя ісціны — але хіба яны калі-небудзь састарэюць? Хіба людзі могуць змірыцца з тым, каб выгадаваныя ў родным

доме дарослыя дзеці не адчувалі да бацькоў ні ўдзячнасці, ні ласкі, ні спачування? У беларускім вясельным фальклоры песень, прысвечаных нявесце-сіраце, вельмі многа. Гэта — яшчэ адзін штрых да характарыстыкі беларускай жанчыны, яе сардэчнай дабраты, чуласці, спагадлівасці.

Паслухайце, калі ласка, сіроцкую песню.

*Гучыць сіроцкая песня.*

***Пяты вучань.*** На заключных этапах вяселля вельмі многа спявалася песень насмешлівых, жартоўных, прысвечаных удзельнікам вясельнай урачыстасці. Песні гэтыя бяскрыўдныя, яны не абражалі ні гасцей, ні гаспадароў, а толькі дапамаглі стварыць вясёлую атмасферу. Яны выяўлялі моцнае прыроднае пачуццё гумару ў працоўнага беларуса, яго зайздросную здольнасць да самакрытыкі, яго любоў да трапнага, жывога і дасціпнага слова, да мудрага, здаровага смеху, іначай сказаць — выяўлялі незвычайнае багацце і шырыню яго душы.

*Гучыць жартоўная вясельная песня.*

***Настаўнік.*** Якое ж вяселле без скокаў? Вашай увазе прапануем «Падыспань».

*Вучні выконваюць танец.*

***Настаўнік.***

А белая бярозачка бялей майго цела,
Не аддаў мяне татачка за каго хацела.

Цэнтральнае месца ў гэтым самым аб'ёмным цыкле беларускай пазаабрадавай лірыкі займаюць песні пра долю замужняй жанчыны, а дакладней і больш справядліва — пра яе нядолю, пра гаротнае становішча маладзіцы ў сям'і мужа.

***Шосты вучань.*** Шкадаванне страчанай дзявочай волі, крыўда на бацьку і маці, што аддалі замуж зусім маладзенькую, на шчаслівейшых братоў і сясцёр, што не прыходзяць адведаць, скаргі на мужа — нярэдка нялюбага, апастылага п'яніцу, на свёкра і свякруху, амаль заўсёды жорсткіх і несправядлівых да нявесткі, на дзевераў і заловак, у большасці выпадкаў нядобрых і неспагадлівых — усё гэта мы чуем у песнях пра сямейнае жыццё.

У сукупнасці сваёй беларускія народныя песні пра жаночую долю — гэта вялікая паэма лёсу жанчыны-працаўніцы, паэма глыбокага чалавечага зместу і высокага трагічнага пафасу. Чытаць і слухаць многія з гэтых песень нялёгка. Болыпасць з іх можна было б далучыць да песень нядолі. Усё жыццё пакутавала жанчына, і яе доля, існаванне былі часткай ўсенароднага лёсу.

Паслухайце песню пра жыццё замужняй жанчыны.

*Гучыць песня.*

***Настаўнік.*** Мы пераканаліся з вамі, наколькі багатая наша песенная спадчына, закрануўшы толькі маленькі яе пласт. Зрабілі першы крок у гэты чароўны свет і засталіся паланёнымі яго непараўнальным хараством і багаццем. Цяпер з яшчэ большай павагай і пашанай будзем думаць пра яго вялікага стваральніка — народ, пра нашу духоўную спадчыну. І сорамна нам цурацца саміх сябе і пазбягаць мінулага цалкам. Нам трэба клапаціцца пра вялікую і прыгожую спадчыну. Пра тое, што мы пакінем для сваіх нашчадкаў.

*Далей вучні выконваюць верш Н. Гілевіча «Спадчына».*

***Пяты чытальнік.*** Гэта спадчына
Мне засталася ад прадзедаў —
Гэта матчыных

Песень дзівоснае прадзіва:
І вясёлых,
І сумных,
І слёзных,
І грозных...
Песні гэтыя
Продкі складалі калісьці,
Бераглі,
Не сцураліся,
Не адракліся:
Ані ў стайнях —
Пад панскімі бізунамі,
Ані ў храмах —
З нянаскімі абразамі.
Не гадамі —
Глухімі, як поўнач,
Стагоддзямі,
Калі ў поле вясною
З сахою выходзілі,
Калі ўвосень мякіну
Бязменамі мералі, —
Продкі ў долю
І ў песню шчаслівую
Верылі...
***Шосты чытальнік.***
Ты журылася, песня,
Ты плакала, песня, —
Русакосай,
Пахілай вярбою над ставам,
Сіратой
Над убогай магілаю маці,
Адзінокай зязюляй
У белым бярэзніку...
Сумавала
Рабінай у полі асеннім,
Жураўліным ключом
У захмараным небе.
Ветрам зімным
У коміне хаты сялянскай...
Галасіла наўсхліп
У застоллі вясельным,
Абягала слязьмі
На дары, на палотны,
На падушкі,
Што мулкімі будуць
Да скону...
Калыхала калыску

На рваных пастронках,
Калаўротам
Гудзела ў цішы вечаровай,
Напівалася п'яна ў карчомцы
На свята,
Па аселіцах росных
Блукала ўначы.
Шаргацела сярпом,
Шалясцела калоссем,
Шапацела сухім мурагом
Пад граблямі
І толькі ніколі-ніколі
Не шамацела рублямі!..
Званочкам
Пазвоньвала на начлезе,
Рассыпалася
Смехам дзявочым па лесе,
Адгукалася
Рэхам на ўзгорках і ў долах,
Булькатала крыніцай
У засені ясеняў,
Ручаінай журчала
Па чыстых каменнях,
То ля самага сонца —
Высока-высока —
Трапяталася жаўранкам
У сіняве.
***Сёмы чытальнік.***
То плыла на плытах —
Па Дзвіне,
Па Дняпры,
Па Бярозе,
То ў закуранай кузні
Гула на кавадле,
Як звон,
То дубовую воссю
Стагнала ў чумацкім абозе,
У далёкай дарозе,
У спёку,
У слоту,
У золь.
То з апаленым крыллем,
Як птах асірочана-грозны,
Узлятала, кружыла
Над вогнішчамі па начах,
Закідаючы іскры
У сонныя панскія гнёзды —

Пад маўклівай ухвалай
Навостраных кос
На плячах.
***Восьмы чытальнік.***
Часта думаю:
Што, каб не матчына песня?
Чым бы дыхаў?
На холадзе чым саграваўся б?
Папрасімцам, напэўна,
Бадзяўся б па свеце,
Жабраком
Між чужых і радні
Пабіраўся б.
З чым пайшоў бы я ў госці
Да добрых суседзяў?
Чым аддзячыць бы змог
За дары іх ад сэрца?
Хто б мяне
Паміж трох міліярдаў
Разгледзеў?
Хто б мяне распазнаў
І, як роўнага, стрэціў?
А цяпер —
Валадар я нязлічаных скарбаў,
І другім не зайздрошчу —
Прызнацца па праўдзе,
І ніхто не пачуе
Ні крыўды, ні скаргаў,
Што не кінуў нічога
Мне ў спадчыну прадзед.
Мне з табою, мой скарб,
На планеце не цесна,
Я з табой —
І вялікі,
І знатны,
І дужы.
Я хачу зберагчы цябе,
Матчына песня,
Каб запоўніць табою
Спусцелыя душы!
Я хачу
Пасяліць цябе ў сэрцах Нашчадкаў,
Каб ніколі мяне
Папракнуць не змаглі,
Каб было перад смерцю
Мне лёгка ад згадкі,

Што я жыў недарэмна
На роднай зямлі.

***Настаўнік.*** І нашы песні даўнія і скокі
Стваралі продкі для сябе саміх.
Яны ж нясуць і сёння ў свет шырокі
Імя зямлі, што акрыліла іх.
Калі табе, пясняр, патрэбны ўрокі —
Дык вось адзін: старайся гэтак пець,
Каб дом свой родны песнямі сагрэць —
Тады пачуе іх і свет шырокі!
Вось і падышло да канца наша свята.

Мы ўдзячны нашым гасцям за добрыя песні, за мажлівасць дакрануцца душою да святога і велічнага. Дзякуем за тое, што вы дапамаглі нам глыбей усвядоміць, што

Мы ўзышлі не з насення, што ветрам занесена, —
Мы не дзікай травы самарослыя парасткі.
У глыбінях зямлі, гераічнай і песеннай,
Нашых душ карані — з вузялкамі упартасці.

*Н. Гілевіч*

*Дзеці дораць кветкі гасцям свята.*

## *Свята-сустрэча з мясцовым паэтам Браніславам Маразом*

**Мэта:**

- пазнаёміць школьнікаў з асобай і творчасцю Б.Ю.Мароза;
- далучаць дзяцей да багацця вусна-паэтычнай творчасці нашай мясцовасці;
- прывіваць любоў і павагу да гісторыі культуры свайго краю.

**Эпіграф:** "Мова мая – гэта кветачка-ружа,
Што не завяне ні ў спёку, ні ў сцюжу".

***Б. Мароз***

**Абсталяванне:** выстава альбомаў, кніг Браніслава Мароза, камп'ютар
**Афармленне:** клас упрыгожаны ў нацыянальным стылі: на дошцы – ручнікі, вышыванкі, на стале – вышываны настольнік, на крэсле – даматканая посцілка, букет з кветкамі.

### Ход мерапрыемства

***1. Уступнае слова настаўніка.***

Сёння ў нашай школе свята. Свята-сустрэча з таленавітым паэтам, добрым і шчырым чалавекам, свята-сустрэча з высокай паэзіяй, адкрытай, чыстай, узнёслай, маладой і сталай. У нас у гасцях вядомы не толькі ў нашым раёне, але і далёка за яго межамі, - паэт, пісьменнік, публіцыст – Браніслаў Юльянавіч Мароз.

Нашую ўрачыстую сустрэчу мы назвалі "У палоне беларускага слова". І гэта невыпадкова. Эпіграфам да яе ўзяты словы з верша Браніслава Юльянавіча "Мова мая" (чытаецца эпіграф). Прадоўжыць нашу сустрэчу я хачу словамі з Вашага, Браніслаў Юльянавіч, артыкула "Усё пачынаецца з сям'і", змешчанага ў раённай

газеце (ад 28. 07. 2007): *"Гадоў сорак таму мой стрыечны дзядзька расказаў мне такі выпадак са свайго жыцця. Падлеткам ён выганяў кароў у поле, і калі самая шкадлівая карова праламіла плот і залезла ў агарод, ён добра агрэў яе пугай і "абклаў" матам. Міма ішоў старэнькі дзядок і сказаў: "Ведаеш, унучок, што сваім матам ты абразіў адразу трох матак: сваю родную, матку-зямельку і самае страшнае – Матку Боскую". З тых пор гэты хлопец ні разу не мацюкнуўся. У тым жа духу выхаваў сваіх дзяцей і ўнукаў. Пражыў доўгае і шчаслівае жыццё.*

*Нядаўна на аўтобусным прыпынку я сустрэў свайго знаёмага з Браслава і ледзь пазнаў яго – счарнелы, схуднелы, як кажуць, скура ды косці.*

*- Што з табой? – спытаў я.*

*- А, браток ты мой, я ў пекле пабываў. Еду з Мінска, дзе рабілі вельмі складаную аперацыю на горле, потым тры дні прыходзіў у сябе. Не дай Бог нікому такое перанесці. Я лічу, што Усявышні даў мне такую пакуту за мой грэх.*

*- Які ж у цябе такі грэх, калі не сакрэт?*

*- Змалку я дужа лаяўся брыдкімі словамі. Кінуў курыць, кінуў піць, а вось мацюкацца не мог адвыкнуць. Ну я цяпер і з гэтым "завяжу".*

*Хачу напомніць шаноўным чытачам "раёнкі" словы з Евангелля ад Яна: "Спачатку было Слова, і Слова было ў Бога, і Слова было Бог..."*

*Задумаемся..."*

Задумаемся сягоння і мы, як важна ў жыцці валодаць разумным словам – гэтай дзіўнай магчымасцю, дадзенай чалавеку прыродай. Паслухаем, як цудоўна гучаць словы, складзеныя ў рад вялікім майстрам, як натхнённа гучыць мова, якая ідзе з душы чуйнага да хараства, нераўнадушнага да людзей, верующага ў Бога чалавека. Браніслаў Юльянавіч, мы будзем слухаць Вас, захапляцца музыкаю Вашай паэзіі і думаць...кожны пра сваё, а разам усе пра адно: як жа добра быць у палоне беларускага слова.

*Дзяўчына спявае калыханку на словы Б. Мароза.*

Спі сыночак мой, люлі-люлі!
Селі галкі на раллі.
Паляцеў салоўка ў гай,
Спі, мой хлопчык, засынай.
Спі, прыгожы, любы мой.
Нават месяц над зямлёй
Спаць улёгся на аблокі.
Спі, мой сокал сінявокі.
На галлі гняздо – калыску
Ціха гойдае вятрыска.
У гняздзе тым птушаняткі
Спяць салодка каля маткі,
Сціх, заснуў пчаліны рой.
Спі і ты, сыночак мой.

***1-ы вядучы.*** Браніслаў Юльянавіч, усе мы родам з дзяцінства – гэта ўсім вядомая ісціна, некалі падобную калыханку і Вам спявала маці.

***2-і вядучы.*** Раскажыце, калі ласка, пра свае дзіцячыя ўспаміны, пра маму, бацьку, сям'ю, пачытайце нам свае вершы, прысвечаныя блізкім людзям.

***Выступленне Б. Мароза***

***1-ы вядучы.***

Люблю я з маленства мой горад Міёры.
Мы разам раслі ля люстранай вады.
Нам дзіўныя песні складалі азёры
І лашчыў, як маці, прамень залаты.

***2-і вядучы.***

З горадам Міёры звязана Ваша самастойнае жыццё. Адсюль, напэўна, пачаўся Ваш шлях у літаратуру. Раскажыце, як гэта было.

***Выступленне Б. Мароза***

***1-ы вядучы.***

Мы ведаем, што на словы Вашых вершаў нашым мясцовым музыкантам і кампазітарам Сяргеем Рыгоравічам Аляксеевым напісана некалькі песень.

***2-і вядучы.***

Зараз мы прапануем паглядзець фільм пра Міёры, зняты яшчэ адным таленавітым земляком – Васілём Сямёнавічам Мядзюхам. У фільме гучаць Вашыя песні.

***Прагляд фільма***

***1-ы вядучы.***

Бы срэбны човен, плыве маладзік
Па-над вадою…
Мілая, любая, шчэ пасядзі
Побач са мною.

***2-і вядучы.***

Браніслаў Юльянавіч, прагучалі радкі з верша любоўнай лірыкі. Раскажыце, калі ласка, пра сваё першае каханне. Ці прысвячалі Вы сваёй абранай вершы? Калі так, то пачытайце іх.

***Выступленне Б. Мароза***

***1-ы вядучы.***

Скажыце, Браніслаў Юльянавіч, а якая пара года выклікае ў Вас найлепшы настрой? Можа, тады лепш і хутчэй пішуцца вершы? Можа, часцей наведвае ў гэтую пару года Муза?

***Выступленне Б. Мароза***

***2-і вядучы.***

А давайце паслухаем, як гучаць Вашы вершы прыродаапісальнай лірыкі ў выкананні нашых вучняў.

***Чытальнікі пад музыку Вівальдзі чытаюць вершы***

***Асенні матыў***

Заблішчэлі, нібы вугалькі,
На сівых балотах журавіны.
Пралятае ў вырай ля ракі
Клін журботны ў небе жураўліны.
Адшумела, адгрымела, адцвіло.
Цішынёй спавіта ўсё ў прыродзе.
Праязджае восень праз сяло

На сатканай з туманоў падводзе.
Меншай стала неба вышыня,
І дажджу пачуўся нудны булькат.
У вяскоўцаў на парадку дня
Роднай нівы каралева – бульба.

***Сакавіцкія промні***

Мех промняў вострых, нібы цвік,
Прынёс з сабою сакавік.
Ён развязаў апоўдні мех –
І паляцелі промні ў снег.
На парыжэлай снежнай скуры
Яны наскрозь прабілі дзюры.
Павеяў вецер з халадком –
Залатаў дзюры ўсе ладком.
Але і хвілі не прайшло,
Як распаўзлося тое шво,
Бо сакавік свае праменні
Пачаў кідаць па поўнай жмені.

***У прыроду***

Вазьму ў рукі кіёчак бярозавы
І за сонейкам следам пайду
У той край, дзе вятры нецвярозыя
З ліп зацвіўшых зрываюць фату,
Дзе схінаецца жыта даспелае
пад цяжарам калоссяў буйных,
дзе над возерам воблакі белыя
Зіхацяць, як са срэбра чаўны.
І душу я, і цела тут вылечу,
Удыхаючы ліпавы пах,
Мову траў дасканала я вывучу,
Для ўзлёту дасць крылы мне птах.
Як салоўка з далёкага выраю,
зноў у горад вярнуся я свой.
З сэрца словы чароўныя высею,
Што прапахлі духмянай травой.

***1-ы вядучы.***

Браніслаў Юльянавіч, скажыце, а Вы шчаслівы чалавек? Калі так, то чаму?

***Выступленне Б. Мароза***

***Чытальнік.***

***Пра шчасце***

Сябры дарагія! Вам мушу прызнацца,
Мне шчасце прыносіць любімая праца.
На ўдарны тэмп з ранку сябе я настрою

І ўвесь дзень працую з цудоўным настроем.
Хоць часам пад вечар наваліцца стома,
Ды крочу вясёлым заўжды я дадому.
Рублі, што дасталіся працай мне, потам,
Аддаць на спіртное не маю ахвоты.
Не можа быць шчасце без шчырых сяброў,
Без ціхіх азёр і шумлівых бароў.
Сябе адчуваю шчаслівым таксама,
Калі я ў нядзельку спяшаю да храма.
Не раз быў адчуўшы шчаслівы я міг
У свеце чароўным мастацтва і кніг.
Яшчэ сваё шчасце я бачу ў каханні,
У светлым і чыстым, як майскае ранне.
Чужой каляінаю шчасце не ходзіць,
На роднай зямлі сваё шчасце знаходзяць.
Само па сабе шчасце нам не даецца.
Яно ў творчай працы заўсёды куецца.

***2-і вядучы.***

У гэтым вершы Вы пішаце:

Сябе адчуваю шчаслівым таксама,
Калі ў нядзельку спяшаю да храма.

Браніслаў Юльянавіч, пракаменціруйце, калі ласка, гэтыя радкі.

***Выступленне Б. Мароза***

***1-ы вядучы.***

Мы ведаем, што падчас святкавання 100-годдзя нашага міёрскага касцёла Вы чыталі ўласны верш, прысвечаны гэтай даце.

***2-і вядучы.***

Мы прапануем паглядзець відэазапіс Вашага выступлення.

***Прагляд відэазапісу***

***1-ы вядучы.***

Сёння нам нельга абысці ў Вашай творчасці і гумарыстычны творы. Сатырычныя куплеты, байкі, гумарэскі…

***2-і вядучы.***

Скажыце, дзе Вы знаходзіце матэрыял для твораў такога гатунку? На якую тэму напісана найбольшая колькасць баек? І яшчэ нам вельмі хацелася б паслухаць іх у Вашым выкананні.

***Выступленне Б. Мароза***

***1-ы вядучы.***

А цяпер выступяць нашы вучні з інсцэніраванай Вашай байкай “Мурка”.

**Выступленне дзяцей**

*Мурка*

Весняю раніцай у цёмным завулку
Стрэў коцік Вася чароўную Мурку.
Лапку на шыйку ёй ціха паклаў
І замурлыкаў: “Каханая, мяў.
Здзіўлены я прыгажосцю тваёй.

Можа б, ты жонкаю стала маёй?”
Мурка ад шчасця свой хвост распушыла,
Коціку Васю ўсміхнулася міла
І, напаткаўшы ля веснічак маму,
Ціха сказала: “Выходжу я замуж.
Вася прыгожы. вясёлы, сучасны.
Доўгія вушы і хвост мае класны”,-
Так расказала дачушка матулі
І да ката паляцела, як куля.
Год праляцеў з той вясёлай пары.
Сумная Мурка сядзіць у двары.
Ціха сваіх кацянятак люляе,
А яе Вася з другою гуляе.

Гэтакім Муркам параіць я мушу:
Трэба глядзець не на хвост, а ў душу.

***2-і вядучы.***
А ці ведаеце вы, хто такі гусляр?
***1-ы вядучы.***
Канечне, гэта чалавек, які іграе на гуслях.
***2-і вядучы.***
Не, мае даражэнькія, гэта той, хто даглядае гусей. А хто такі маладзік?
***1-ы вядучы.***
Не хто, а што. І гэта малады месячык.
***2-і вядучы.***
А вось і не. Маладзік – гэта муж маладзіцы. А графік – сын графа. А куратнік – месца для курэння.
***1-ы вядучы.***
Мне ўсё зразумела! Ты, напэўна, гартаў тлумачальны слоўнік Браніслава Юльянавіча. Такія тлумачэнні можа даць толькі той, хто ўдумліва адносіцца да слова.
***2-і вядучы.***
Браніслаў Юльянавіч, як у звыклых словах знайсці такі “патаемны” сэнс?

***Выступленне Б. Мароза***

***1-ы вядучы.***
Працягам нашай вясёлай размовы стауць Вашы частушкі ў выкананні вучняў нашай школы.

**Гучаць частушкі**

- Можа б, сын, памог мне трохі?
- Не магу, у мяне ўрокі. –
Буркнуў злосна хлопчык Жора
І прыкрыў “Трох мушкецёраў”

У першым класе ліў я слёзы –
Пасадзілі побач з Розай.

А ў дзесятым сеў з ёй Якаў,
Я ад зайздрасці заплакаў.

Наша Мая да ўрокаў
Стракатала, як сарока.
А пайшла да дошкі Мая –
Раптам стала, як нямая.

Што са мной не прывітаўся? –
Настаўнік у вучня запытаўся.
-Дык вы ж вучаце не ў нас, -
Пачуў ён раптам у адказ.

Саша ў школе гаманлівы,
Б’е аб зубы свой язык.
Памаўчаць і паўхвіліны
Нат на ўроку не прывык.

Глеб хваліўся перад Клавай,
Што ён добра ўмее плаваць.
Сапраўды, “паплаваў” трошкі
Ён на хіміі ля дошкі.

-Як закончу дзесяць класаў,
Ажанюся, - кажа Вася, -
Трошкі ў цешчы адпачну,
Працаваць пасля пачну.

***1-ы вядучы.***
Бранісла Юльянавіч, мы для Вас падрыхтавалі сюрпрыз.
Вы, напэўна, ведаеце, што ўнучка Вашай стрыечнай сястры займаецца ў нашай школе. Завуць яе Ірына Радзіхоўская.

***2-і вядучы.***
А ці вядома Вам, што яна піша вершы? Напэўна, не. І яшчэ адна Ваша сваячніца - Алена Басікірская - таксама паэтэса. Гэта наводзіць на думку, што Ваш род адзначаны таленавітасцю, творчым пачаткам.

***2-і вядучы.***
Давайце ўсе разам паслухаем Ірыну. Яна прачытае два свае вершы.

**Ёсць вёсачка ціхая…**

Ёсць вёсачка ціхая ў нашым раёне,
Дзе сонейка цёплае свеціць ярчэй,
Дзе ручая серабрыстага гоман,
Дзе песні спявае гучней салавей.

Тут школа старая ў гонкіх бярозках,
Зялёныя "горы", амшары тут ёсць,
У гэтай вось школе, на гэтых пагорках
Бабулі маёй прайшла маладосць.

Жывуць тут цудоўныя, добрыя людзі
З адкрытаю свету чулай душой.
І вельмі я рада, што тут, ля Міёраў,
Жыву я ў вёсачцы ціхай сваёй.

Дворным Сялом гэта вёска завецца.
Яна хоць маленькая – тут пабывай.
І застанецца заўсёды ў сэрцы
Гэты куточак, чароўны мой край.

**Мои рисунки**

Я не знаю, что мне делать…
Я не знаю, как мне быть…
А-а-а! Придумала! Идея!
Надо срочно мел добыть.
Нарисую на асфальте
(Мел скорее только дайте)
Нашу серенькую кошку,
Как она глядит в окошко.
А за кошкой будет мышка –
Эта серая воришка.
Нарисую я и будку,
А на будке – незабудку.
Возле будки сидит пёс,
Вверх задрал он чёрный нос.
В небе – птиц. Ну, а пока
Нарисую облака.
А потом – и самолёт,
А на море – целый флот.
Буду всё я рисовать,
Вам осталось мел мне дать.

***1-ы вядучы.***
Браніслаў Юльянавіч, што Вы можаце сказаць Ірыне пра яе вершы як сталы, вопытны і мудры пісьменнік?

***Выступленне Б. Мароза***

***2-і вядучы.***
Падыходзіць да канца наша сустрэча. Зразумела, што за такі кароткі час нельга ахапіць усе тэмы і матывы Вашай творчасці.

***1-ы вядучы.***

Але і яго было дастаткова, каб зразумець, што Ваша душа заўсёды была ў палоне нашага пяшчотнага, поўнага шчырасці, кроўнага беларускага слова.

***2-і вядучы.***

І напрыканцы мы яшчэ раз хочам акунуцца ў мелодыю Вашай паэзіі. Давайце паслухаем папуры з вершаў розных гадоў, рознага зместу і тэматыкі.

**Папуры з вершаў Б. Мароза**

**1.** Хіба х можна пра кут свой забыцца,
Дзе звініць пад гарою крыніца,
Дзе засеяны радасцю гоні,
Дзе мазоль першы лёг на далоні.
Дзе абняў малады клён таполю –
Гэты кут палюбіў я да болю.
Са сцюдзёнай празрыстай крыніцы
Там нап'юся гаючай вадзіцы,
І адчую моц зноўку і сілу…
Добры дзень, кут мой родны і мілы!
*( "Родны кут" )*

**2.** Белы пух ляціць з таполяў
І кружыцца, нібы снег:
Апускаецца на поле –
Узлятае зноўку ўверх.
Непаседы – шпачаняты
Павылазілі з "дамоў",
Бы свавольныя рабяты,
Больш не слухаюць бацькоў.
Цёплы ветрык лашчыць твары,
Сушыць срэбную расу,
Наліліся сокам травы,
Клічуць вострую касу.
*( "Чэрвень" )*

**3.** З тваіх рук я не выпіў да дна
Келіх шчасця – віна векавога.
Ты адна ў маім сэрцы, адна –
І не трэба мне болей нікога.
Я ўсё той, па-ранейшаму той:
Хоць смяюся ды ўпотайкі плачу.
Да людзей я хінуся душой
І спяшаю к табе пры няўдачах.
Ад цябе я вяртаюся ў свет
Добры, ласкавы, з чыстым сумленнем
І душу зарадзіўшы як след,
Паэтычным, высокім натхненнем.
*( "Каханне" )*

**4.** Заблішчэлі, нібы вугалькі,
На сівых балотах журавіны.
Пралятае ў вырай ля ракі
Клін журботны ў небе жураўліны.
Адшумела, адгрымела, адцвіло.
Цішынёй спавіта ўсё ў прыродзе.
Праязджае восень праз сяло
На сатканай з туманоў падводзе.
*( "Асенні матыў" )*

**5.** Усмешка – гэта дар прыроды,
Што сее ўсюды зерне згоды,
Што дарыць радасць і натхненне
І вырывае зла карэнне.
Цвіла каб згода паміж люду,
Дары ты ўсмешкі свае ўсюду.
*( Усмешка" )*

**6.** Зазірнуў праз шыбу
Ранак прамяністы,
Абудзіў сялібу
Певень галасісты.
Дзынкнула ля сенцаў
Пчолка, нібы куля.
Адчыні акенца,
Мілая матуля!
Зноў няхай так будзе,
Як было тут колісь,
Мне пяшчотна грудзі
Хай прамень праколе.
З-пад квяцістай хусткі
Свецяць вочы ласкай.
Ем пірог я хрусткі
З вэнджанай каўбаскай.
Пеніцца ў кварце
Сырадой духмяны…
А ўжо скроні маці
Іінеем убраны.
Твар яе і рукі
Зрэзалі маршчыны –
Гэта след разлукі
І чакання сына.
*("У гасцях у маці" )*

**7.** Над празрыстай, як шклянка, вадой

Я сяджу з ненаглядней сваёй.
Яе тварык пылае, як жар,
Яе вочкі – праменні з-пад хмар.
Галасок, бы той птушачкі, спеў.
Я ад шчасця зусім анямеў.
З клейкіх лісцяў нахіленых лоз
Вецер строс долу кропелькі рос.
З-пад гары па люстранай вадзе
Вось і вечар ціхутка брыдзе.
Пацямнела нябесная сінь,
Штосьці шэпча азёрная плынь,
Сее зорка крышталь над зямлёй,
Светлы месяц схіліўся над ёй.
Вось бы так усю ноч прасядзець
І на зорнае неба глядзець,
Слухаць сэрца трывожнага стук,
Гладзіць жылкі бялюсенькіх рук.
*( “Ля возера” )*

**8.** З шэрага граніту абеліскі
На маёй параненай зямлі.
На іх прозвішчы каханых, блізкіх,
Што ад куль фашысцкіх паляглі.
Не даецца лёгка перамога,
Жыццяў шмат аддана за яе.
Мужа, брата, сына дарагога
Сёння многім, многім не стае.
Каб ніколі наша шчасце мінамі
Не змаглі чужынцы ўзарваць,
Трэба быць, сябры, заўсёды пільнымі,
Працай край бацькоўскі мацаваць.
*( “Будзьце пільнымі” )*

**9.** Дзе рэчка шумлівая Друйка
Злучаецца з маці – Дзвіной,
Здаўна там пасёлачак Друя,
Як ветразь, стаіць над вадой.
Ён продкаў далёкіх калыска,
Прыгожы і светлы куток.
Ён сэрцу жаданы і блізкі,
Бо тут майго краю выток.
*( “Старажытны пасёлак” )*

**10.** Паклон табе, родная вёска!
Хай сонечным будзе твой ранак.
Зрываюцца з вішань пялёсткі,

Як снег, ападаюць на ганак.
І роем плывуць успаміны
Аб днях маладых маіх, весніх.
І зноўку кагосьці дзяўчына
Чакае ля мілых мне весніц.

*( "У роднай вёсцы" )*

**11.** Мова мая – гэта кветачка ружа,
Што не завяне ні ў спёку, ні ў сцюжу.
На старажытных руінах-каменнях
Ёсць гэтай мовы адбіткі-праменні.
……………………………………………
Родныя словы, мае вы каралі!
З белага кужалю продкі вас спралі.
……………………………………………
Мова мая – гэта песні Купалы,
Што ў маё сэрца з маленства запалі,
Гэта цудоўнай паэзіі голас,
Што мне пакінуў у спадчыну Колас.
Мова мая – гэта раніцы ўсмешкі,
Водар духмяны пяшчотнай пралескі,
Птушачкі спевы над полем уранку,
Гэта дзяцінства майго калыханка.

*( "Мова мая")*

***Заключнае слова настаўніка***

Паважаны Браніслаў Юльянавіч, нельга злічыць тыя іскрынкі Вашай паэзіі, якія западаюць у душу і твораць там дзівосныя рэчы: хочацца быць лепшым, разумнейшым душою, больш спагадлівым, чуйным, абачлівым, цярпімым.

Ад усіх прысутных я хачу пажадаць Вам моцнага здароўя, натхнення ў літаратурнай творчасці, дабрабыту, суладдзя з сабой і Сусветам. Яшчэ доўгія-доўгія гады радуйце чытачоў сваёй паэзіяй, прозай, публіцыстыкай. Хай беражэ Бог Вас, добрага чалавека і таленавітага майстру, і для сям'і, і для літаратуры. Мы будзем чакаць сустрэчы з Вамі на старонках перыядычнага друку і, канечне, у нашым школьным доме.

***Госцю ўручаюцца кветкі.***

## Запрашэнне да роздуму

## *"Якою цаной заваёвана шчасце…"*

**Мэты і задачы:** паглыбіць веды навучэнцаў па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны; дапамагчы ўсвядоміць думку аб жорсткасці вайны, яе бязлітаснасці да людзей, аб трагедыі дзяцей, пазбаўленных дзяцінства праз вайну; садзейнічаць выхаванню ў навучэнцаў пашаны да гісторыі беларускага народа, гонару за свой народ, любві да роднай зямлі.

**Афармленне дошкі.**

У цэнтры дошкі запісана тэма (“Якою цаной, заваёвана шчасце…”), вытрымкі з верша А.Вярцінскага, размешчаны рэпрадукцыі карцін І.Тойдзэ “Родина-мать зовёт”, “Герой Савецкага Саюза З.А.Касмадзям’янская” і іншыя; злева пад запісанымі словамі “У чым правініліся перад варварамі малыя дзеці, жанчыны, бездапаможныя старыя...” размешчаны афорты А.І.Харшака, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне “1941-1945”; справа, пад запісанымі словамі “Шмат гора пабачылі дзяды і прадзеды, і шмат герояў нарадзіла наша зямля” размешчаны рэпрадукцыі карцін; на зваротным баку дошкі – малюнкі вучняў.

**Абсталяванне.**

Сталы пастаўлены літарай “П”, на сталах – ліхтарыкі са свечкамі; метраном; відэамагнітафон; запіс відэафільма “Усе дарогі вядуць у Стэфанова”; магнітафон; аўдыёзапісы: Левітан “Пачатак вайны”, Л.Ван Бетховен “Саната №14”, мелодыя песні “Хатынь” у выкананні ансамбля “Песняры”, сімфанічная паэма Алоўнікава “Партызанская быль”, мелодыя “Песня народнага яднання”, Г.Вагнер сімфанічная паэма “Вечна жывыя”, Шастаковіч “Сімфонія №15”, В.А.Моцарт “Рэквіем”, Ф.Шуберт “Ave Maria”, звон колакала.

**Ход мерапрыемства**

*(гучыць Саната №14 Л. Ван Бетховена)*

***Настаўнік.*** Паважаныя калегі, госці, вучні!

У 2015 годзе адзначаецца 70-я гадавіна Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. 70 год мірнага жыцця, 70 год над намі блакітнае мірнае неба. Не так многа засталося тых, хто, не шкадуючы сябе, каваў Перамогу.

Яна прыйшла да нас з яркай, непаўторнай вясной. Гэта свята са слязамі на вачах.

У памяць аб тых, хто падараваў нам мірнае жыццё, але не дажыў да сённяшніх дзён, хто загінуў, абараняючы нас, я запрашаю вас да роздуму “Якою цаной заваёвана шчасце…”

Вайна... На вайне... Пра вайну... Як часта мы чуем гэтыя словы. А ці ведаем мы, што такое вайна?

Вайна... Страшнае слова, ад яго цяжка робіцца на душы. А што можна сказаць пра пачуцці людзей, якія самі прайшлі праз ваеннае ліхалецце, дзяцінства якіх было апалена вайной.

Бяду ніколі не чакаюць. Раптоўна грымнула яна ў той самы доўгі, самы светлы ў годзе дзень, але які аказаўся самым змрочным у гісторыі краіны. Дзень 22 чэрвеня 1941г.

*(Гучыць запіс голасу Левітана аб пачатку вайны.Потым – мелодыя песні “Хатынь” у выкананні ансамбля “Песняры”)*

***Настаўнік.*** 2млн. 400тыс. жыхароў рэспублікі сталі ахвярамі фашызму. Вораг знішчаў цэлыя вёскі.

Вы не знойдзеце сёння на карце назваў 186 вёсак, якія не былі адбудаваны пасля Вялікай Айчыннай вайны, бо ніводнага іх жыхара не засталося ў жывых.

Ці маглі беларусы спакойна жыць, гледзячы на ўсе здзекі фашыстаў? Не. Пачалося ўсенароднае супраціўленне нямецкім захопнікам. Ствараліся партызанскія атрады ў лясах, падпольныя групы ў гарадах і вёсках.

Шмат гора пабачылі нашы дзяды і прадзеды, і шмат герояў нарадзіла наша зямля.

Фашысты не спыняліся ні перад якімі злачынствамі, каб замацавацца на захопленай зямлі, знішчалі цэлыя гарады і вёскі, забівалі жанчын, дзяцей і старых, руйнавалі і палілі народнае дабро. Не мінула гэта бяда і нашу вёску.

*(Гучыць песня "Дворнае сяло". Муз.Пракоф'ева А.У., сл. Пятровай Н., выконвае вакальная група)*

Прагучала страшнае: вайна!
Выйшла рота з нашага сяла.
Дворнае Сяло,
Грознае Сяло,
Ты ўдоваў і сірот суцешыць не змагло.

*(Іграюць цымбалы)*

Далёка пойдзеш ты ці блізка,-
Усюды, край мой дарагі,
Цябе пакрылі абеліскі,
Як сімвал гора і тугі.
Баліць, шчыміць Радзімы сэрца.
І кожны міг, і кожны час
Яе героі на паверцы
Стаяць жывымі сярод нас.
Пятнаццаць воінаў-дварнасельцаў пайшлі ад роднага парога ў бессмяротнасць. Вось іх імёны:
Антонаў Нестар, Арол Уладзімір, Канах Ігнат, Мацюк Леанід, Кухаронак Канстанцін, Арол Аляксандр, Заяц Уладзімір, браты Аркадзь, Міхаіл, Яўстафій Мацюкі, Канах Іван, Пальчэх Пётр, Арол Іосіф, Шокель Генадзь.
Дворнае Сяло,
Мужнае Сяло,
Аб сынах сваіх у сэрцы памяць зберагло.

***Настаўнік.*** Памяць людская... Юнае пакаленне XXI стагоддзя не ведае жахаў вайны. Але мы ніколі не павінны забываць пра тых, хто падараваў нам радасць мірнага жыцця.. На жаль, у мікраараёне нашай школы ўжо не засталося ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, але яны пакінулі нам свае ўспаміны аб вайне. Некаторыя з іх мы зараз пачуем.

*(Муз. Алоўнікава "Партызанская быль", сімфанічная паэма)*

***Першы вучань.*** У 1943 годзе быў прызваны ў ваенкамат і накіраваны ў партызанскі атрад Якаў Сямёнавіч Нікіфараў. Партызанская група складалася з трох чалавек, якія займаліся падрывам цягнікоў, знішчэннем варожай тэхнікі. Група дзейнічала на тэрыторыі Міёрскага і Шаркаўшчынскага раёнаў.

У час адной з баявых аперацый быў цяжка паранены. Асколкам была разарвана шчака, шрамы захаваліся да цяперашняга часу.

***Другі вучань.*** Пётр Іосіфавіч Юхна вызваляў Прыбалтыку. Назаўсёды застаўся ў памяці першы рукапашны бой. А было гэта ранняй вясной. Вораг замацаваўся на процілеглым баку ракі. Быў аддадзены загад выбіць ворага. Прыходзілася перабірацца па падталым тонкім лёдзе. Ішлі, паўзлі. Некаторыя байцы правальваліся пад лёд. На процілеглым беразе ўступілі ў бой. У выніку вораг быў разбіты. Сваіх байцоў, якія загінулі ў гэтым баі, пахавалі ў брацкай магіле. Загад быў выкананы.

Памяць ветэрана захавала не толькі баі, атакі, варожыя бамбандзіроўкі, але і кароткія хвіліны адпачынку, прывалы, калі была магчымасць напісаць ліст дадому з надзеяй, што ён дойдзе да родных і блізкіх. Доўгачаканы час перамогі набліжаўся. Дзень Перамогі Пётар Іосіфавіч сустрэў на Прыбалтыйскай зямлі.

***Ветэранам у Дзень Перамогі.***

*(гучыць музыка "Песня народнага яднання")*

***Трэці вучань.***

Ідуць, ідуць ветэраны,
Як чародкі буслоў на Спас.
Усмешкі вам дараваны,
Удзячнасць у сэрцах – ад нас.
Святло ад вас прамянее,
Наўкол урачыстасць плыве.
А сэрца ад роспачы млее
Аб тых, хто ўжо не жыве.
Я ведаю, што гаротны
Вам выпаў жыццёвы лёс.
І час трывожны, маркотны
Ад роднай зямлі вас аднёс.
Якія вы бачылі жахі
І колькі дарог прайшлі!
Як гордыя, смелыя птахі,
Стаялі за славу зямлі.
У бітве няроўнай, мужнай
Загінулі многія з вас.
У зямельцы нямілай, скрушнай
Навекі пакінуў іх час.
Вясною, калі ажывае
Прырода ад зімняга сну,
Яна вашы душы вяртае
На любую сэрцу зямлю.
У кожным дыханні пялёстка,
Лістоты зялёнай зямлі.
Я чую ваш голас Боскі
І позірк вачэй з цішыні.
Сівыя, храбрыя воі,
Жывіце даўжэй на зямлі,
Каб вашай сумленнасці ўстоі
Глыбей у нашы душы ўвайшлі.
Ідуць, ідуць ветэраны,
Як чародкі буслоў на Спас.
Усе кветкі зямлі дараваны
Вам у гэтакі зорны час.

Вера Тачкар

*(Муз. Г.Вагнера "Вечна жывыя", сімфанічная паэма)*

***Настаўнік:*** Памяць людская... Яна жыве ў сэрцы кожнага, хто прайшоў праз пекла фашысцкага палону, хто знайшоў у сабе сілы выжыць і расказаць сёння, што такое фашызм, што такое вайна. Памяць аб вайне перадаецца з пакалення ў пакаленне. Слова ўнукам сведкаў ваеннага ліхалецця.

***Чацвёрты вучань.*** У сям'і, дзе гадавалася мая бабуля, было пяцера дзяцей. Яна – самая меншая. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, ёй ішоў 5-ы годзік. Балючы ўспамін той пары – гэта момант развітання яе бацькі, майго прадзеда, з сям'ёй перад адыходам у войска. Яна помніць, як ён падышоў да яе, падняў, пасадзіў на калені, доўга гладзіў рукою па галаве і глядзеў у вочы, нібы, развітваючыся назаўсёды, хацеў добра-добра запомніць вобраз маленькай дачушкі. Потым выйшаў з хаты. А яна, стоячы на падаконніку, махала ручкаю яму ўслед.

Дадому бацька маёй бабулі не вярнуўся, ён загінуў на Эльбе. А ў вачах бабулі да гэтай пары дарагая постаць, убачаная праз шкло аконнай рамы.

У дні вайны Любоў Макараўна была зусім маленькай. Мела толькі 6 годзікаў. І ў такім узросце ей давялося стаць сведкам страшэннага відовішча. Гэта было летам. Вечарэла. Немцы наляцелі на вёску, робячы аблаву на партызан. Завязаўся бой. Свісталі кулі, узрываліся гранаты. Было дужа страшна. І вось пасля чарговага выбуху яна ўбачыла, як байцу адарвала ўзрывам галаву, якая пакацілася па зямлі. А цела, акрываўленае, безгаловае, з вінтоўкай у руках, па інерцыі яшчэ бегла некалькі крокаў, а потым рухнула на траву.

Гэта было страшнае відовішча. Яно ўставала як прывід перад вачыма жанчыны, калі размова заходзіла пра вайну.

У чым правініліся перад варварамі малыя дзеці, жанчыны, бездапаможныя старыя?

У тым, што людзьмі былі, што дыхалі, жылі. Адных забівалі за тое, што яны – славяне, другіх – што татары, цыгане, яўрэі.

***Настаўнік.*** Вечным болем перапоўнены сэрцы матуль, чые дзеці не вярнуліся з вайны.

*(Гучыць мелодыя песні "Хатынь" у выкананні ансамбля "Песняры")*

**Вечны боль**

***Пяты вучань.*** Цягнік галёкнуў на паўстанку,
І ўздрыгнула матуля ўся:
Зноў не прынёс сыночкаў Янку
І дарагога Петруся.
Надзеўшы новую хусцінку,
Што падарылі ёй сынкі.
Штодзень выходзіць на хвілінку
Яна праводзіць цягнікі.
І кацяцца слязінкі градам –
Вайне праклён, вайне папрок:
Ляжыць Іван пад Сталінградам,
Ляжыць пад Віцебскам Пятрок.
Па ўсёй пакутніцы Русі –
Магілы брацкія, як раны.
К нам не вярнуліся Іваны
І дарагія Петрусі.

І будзе век Радзіма-маці
З трывогай сніць надзеі-сны,
Чакаючы свайго дзіцяці,
Што не вярнулася з вайны.

А.Кавалевіч

***Настаўнік.*** Так, не вярнуліся многія, але некаторым пашчасціла дачакацца сустрэчы з роднымі, блізкімі. Але якімі цяжкімі і трывожнымі былі гэтыя чаканні.

***Інсцэніроўка "Чаканні".***

*(Гучыць Сімфонія №15 Шастаковіча)*

Зіма 1945 года. Сялянская хата. На сцяне фотакарткі радні. Ля печы старая гатуе вячэру. За сталом Юраська з самаробнай гарматы расстрэльвае варожыя "танкі-бульбіны", што насоўваюцца на яго гармату. Расстраляўшы ўсе "танкі", доўга да нечага прыслухоўваецца, гледзячы на замёзлую шыбіну. Раптам яму здалася лаянка немцаў, рогат, стрэлы, візг сабакі. Юраська ўсхапіўся, глядзіць у акно... старая зірнула на ўнука, дастала з пячуркі бутэльку з вадой, наліла трохі ў кубачак.

***Бабуля:*** Юраська! Унучак! Чуеш? Хадзі да мяне.

Хлопчык раптам імкліва ўскочыў на лаўку, прытуліўся шчакой да фотакарткі бацькі.

***Юраська:*** Тата! Родненькі! Татачка! Я баюся. Баюся. Яны плывуць.. плывуць з усіх бакоў і ўсе да нашага берага ... жываты раздутыя... Я баюся... абарані, татачка...

Старая схапіла хлопчыка на рукі, прытуліла да сябе.

***Бабуля:*** Унучак... дзетка... ды чаго ж ты... не бойся... Няма іх ужо... прагналі. Тата хутка прыедзе... хутка... не бойся. На папі... папі, саколік мой родненькі... папі.

Хлопчык папіў вады. Супакоіўся. Увайшла з марозу маці Юраські, падышла да печкі, грэе рукі, распранаецца, з болем глядзіць на сына. Старая ставіць на стол міску з бульбай, у другую налівае сыраквашу. Мар'я распранаецца.

***Мар'я:*** Ад Сямёна нічога не было?

***Бабуля:*** Нічога.

Мар'я падыходзіць да стала, садзіцца побач з сынам, прытуляе яго да сябе. Усе глядзяць на фотакартку Сямёна.

***Бабуля:*** Давайце вячэраць, а то бульба астыне!

***Юраська:*** Не хачу!

***Мар'я:*** Ты чаго гэта, сынок? Трэба есці, многа трэба есці, каб дужым быць. Такім, як тата. Хочаш быць такім, як тата?

***Юраська:*** Хачу. *(Бярэ лыжку, глытае яду праз сілу.)*Я тады іх усіх.. усіх пазабіваю... усіх, што прыйшлі.

***Мар'я:*** Хто? Куды?

***Бабуля:*** Ды рака ўскрылася. Трупы нямецкія да берага прыбіла... разбухшыя.

***Юраська:*** У засаду палеглі... чакаюць, пакуль мы да іх пабяжым.

***Мар'я:*** *(глядзіць на сына, потым на старую, уздыхае).*Еш, сынок... Еш.

***Юраська:*** Мама, Васеў бацька ўчора прыйшоў з фронту. Вечарам. А яго не пазналі. Кажуць – наш бацька на фронце... А я свайго татачку адразу б пазнаў... Адразу... Мама, а чаму ад нашага таты няма пісьмаў? Усім прыносяць, а нам няма. Ён ранены, мама? Га?

***Бабуля:*** Што ты вярзеш, дурны? Вось зараз, як плясну лыжкай па ілбе, скажаш толькі шчэ раз.

Юраська схаваўся за маці.

***Юраська:*** Можа! Калі б ён не ранены, то пісаў бы...

***Бабуля:*** Пагавары шчэ...

***Мар'я:*** Мама, не крыўдуйце... ну што ён разумее.

***Юраська:*** Я ўсё разумею. Ты заўсёды кажаш, што я малы. А Васёў бацька сказаў, што я ўжо вялікі.

Мар'я пачала сцяліць ложак. Старая палезла на печ. Укладваюцца спаць. Доўга маўчаць.

***Бабуля:*** Што ж ты такая сумная, нявестачка? Змарнавалася, родная? За Сямёна не бойся. Будзе жывы, Мар'ечка. Вернецца. Я ўжо ведаю. Чаго толькі сябе зводзіць, у сухоты ўганяць...

***Мар'я:*** Не магу я. Так баюся, каб чаго з ім, крый божа, не здарылася.

***Бабуля:*** А ты паплач, Мар'ечка, паплач. Жаночая сляза, што вада, а паплачаш і – лягчэй. Паплач.

***Мар'я:*** Нашто. Хіба слязьмі паможаш чаму?

Юраська заснуў. Мар'я прытуліла яго да сябе, глядзіць на сыночка, а сон усё не ідзе. Раптам Юраська страпянуўся ў сне.

Стук у дзверы. На печцы заварушылася старая.

***Мар'я:*** Сямён... Сямёнушка... Родненькі... Саколік... Маці... Даражэнькая... Сямёнушка мой.

Усхапілася Мар'я, стаіць, як укопаная. Старая злезла з печы, вокхаючы, запаліла лямпу, адчыніла дзверы.

***Бабуля:*** Дзе той Сямён? Гэта ж брыгадзір твой, трасца яму, бяссонаму.

Уваходзіць брыгадзір, зусім малады хлопе.

***Брыгадзір:*** Прабачце. Я не да Вас. Мар'я, тут справа такая... ну, што... карацей... Заўтра зноў паедзеш у лес... ну, і ўсё. Што з табой... Ты хворая?

***Мар'я:*** Нічога-нічога. Мне здалося *(накінула на сябе хустку)*. Не глядзі... я паеду.

***Брыгадзір:*** Ну, бывайце *(перад дзвярыма).* От ліха, ледзь не забыўся. Тут табе, Мар'я, пісьмо – узяў на пошце... Другі дзень нашу.

***Мар'я:*** Пісьмо.*(Рукі задрыжэлі, разарвала канверт, ліст з друкаванымі літарамі паплыў перад вачыма)*. На ... Максім... на.

***Брыгадзір:*** Ты гэта... супакойся *(чытае).* "Дзень добры, мае родныя Мар'ечка, Юраська і мая дарагая матуля. Ты, Мар'я, мабыць, ужо хвалюешся, чаго так доўга не пісаў. Дык от – паведамляю, мая дарагая жонка, што я, як і раней, так і ў цяперашні час, жывы і ў асноўным здаровы. Толькі выйшла адна маленькая прыгода. Пры пераправе правалілася пушка з маёй батарэі. Ну дык вось, пакуль вызвалілі яе з-пад ільда, то прымарозіў я два пальцы на правай руцэ. З прычыны таго і друкуе гэта пісьмо на пішучай машынцы наш пісар. Так што ў мяне ўсё ў парадку. Адно непакоіць, як там у вас дома. Як мой сынок, як мама. Асабліва, канешне, як ты там адна па гаспадарцы..."

Мар'я плача. Брыгадзір пачаў супакойваць яе.

***Мар'я:*** Не трэба... Гэта так.. так сабе... Жанорчыя слёзы... чакала, чакала... Столькі чакала... Нібы чула.

Брыгадзір моўчкі пасунуўся да дзвярэй і слізгануў за парог.

***Мар'я:*** Жывы... жывы, дзякуй Богу. Дурная, чаго плачу... Трэба смяяцца, а ў мяне – слёзы.

***Бабуля:*** *(абдымаючы нявестку)* От і прыйшлі яны, тыя слёзы... прыйшлі, нарэшце.

Праз нейкі час.

Лета 1945г. Юрась гуляе на падлозе са сваёй гарматай. Шырока расчыніўшы дзверы, уваходзіць вайсковы. Чамадан з яго рук бразнуў на падлогу. Юраська знямеў са спуду. Вайсковы схапіў хлопчыка, прыцІснуў да сябе. Па абветраным твары пакаціліся слёзы.

***Сямён:*** Сынок... Родны... Юраська... Сыночак. Ты чаго, сынок? *(Юраська маўчыць)* ты чаго, родны?

***Юраська:*** Так.

***Сямён:*** Пагана табе?

***Юраська:*** Пусці.

***Сямён:*** Чаму? Я ж твой бацька... Бацька – разумееш?

***Юраська:*** Пусці.

***Сямён:*** Ну што ж. *(Бацька апусціў Юраську на падлогу, і ён умомант шыбануў у куток між ложкам і печчу, сочачы адтуль недаверліва, гатовы нырнуць пад ложак)* А мама дзе?

***Юраська:*** Пайшла ў магазін. Хутка вернецца.

***Сямён:*** А баба Анця дзе?

***Юраська:*** Па соль пайшла.

***Сямён:*** Пазычыць?

***Юраська:*** Ага...

***Сямён***: Што ж, хоць ты і не прызнаешся, - я ўсё-такі буду як дома. *(Адчыніў чамадан)* во ледзь не забыў! *(дастаў губны гармонік, зайграў)* Падабаецца? Гэта табе!.. Губны гармонік. Бяры! Не сумнявайся! Табе належыць. *(Падышоў да Юраські, працягнуў яму гармонік. Юраська разглядаў яго са здзіўленнем, зайграць не наважыўся)* Ты чакаў бацьку, Юрась?

***Юраська:*** Чакаў.

***Сямён:*** Ну вось. А такі няветлівы!

Стукнулі дзверы, увайшла Мар'я і стала акамянеўшы ля дзвярэй, хапіла паветра. Бацька кінуўся да яе. Крэпка абняў і пацалаваў.

***Мар'я:*** Сямён... Родны... хіба ж можна так доўга... Ой, колькі я чакала цябе! Іду адкуль-небудзь дадому і кожны раз думаю, што ты, можа. Ужо даўно дома сядзіш. Пачую які стук і думаю – гэта ты стукаеш... Бачыш, які вялікі Юраська вырас! Ён таксама чакаў.

***Сямён:*** Дзе там чакаў! Каб чакаў, то спаткаў інакш.

***Мар'я:*** Артылерыст ты мой дарагі. *(Пацалавала сына і лёгка штурхнула да бацькі)*. Гэта твой тата. Той, пра якога я табе гаварыла... Ён цяпер заўсёды будзе з намі.

Увайшла бабуля, убачыла сына і абамлела. Маці і бацька кінуліся да старой.

***Настаўнік.***Сляза заўсёды горкая,
А пот – салёны,
А кроў – чырвоная,
А гора – чорнае.

Ва ўмовах таталітарнай сістэмы некаторыя старонкі нашай гісторыі замоўчваліся ці фальсіфікаваліся. Перш за ўсё гэта датычыць рэпрэсій, якія напаткалі людзей былой Заходняй Беларусі ў 50-ыя гады.

У свой час Аляксандар Салжаніцын пісаў: "Нікому не перагарадзіць шляхоў праўды".

Не абмінулі рэпрэсіі і нашых землякоў. Закрэўская Марыя Уладзіміраўна, якая многа гадоў працавала загадчыцай Дварнасельскага ФАПа і якую вы ўсе добра ведаеце, у 1951 годзе разам з бацькамі і сёстрамі была вывезена ў Сібір. Чаму? Пра гэта мы даведаемся з фільма.

***(Фільм з цыкла "Незабыўнае" "Усе дарогі вядуць у Стэфанова")***

Толькі ў маі 1958 года сям'я вярнулася на Радзіму. Мінула яшчэ некалькі год, пакуль быў апраўданы і прызнаны ветэранам Вялікай Айчыннай вайны Уладзімір Іванавіч Міклушонак

*(Гучыць "Рэквіем" В.А.Моцарта)*

***Шосты вучань.*** Ля брацкай магілы
Успомнім у гэты дзень вясновы
Сваіх знаёмых і сяброў
Жалобным нашым добрым словам.
Усіх, хто сёння не прышоў.
Адных забілі ў Курапатах,
Другія не прыйшлі з вайны,
Памерла многа з сорак пятай
Да мая сённяшняй вясны.
Яны ж імкнуліся, тварылі,
Пакінулі свае сляды.
Жыццё й пакутны край любілі,
А іх адправілі туды.
Ім кожны з нас жыццём павінен –
Мы будзем помніць іх заўжды.
Не зарасце навек сцяжына,
Якой прыходзім мы сюды.

Васіль Голуб

***Настаўнік.*** Помнікі і абеліскі. Памяць людская... А ці заўсёды помнім мы тых, хто ў такіх муках пражыў апошнія хвіліны зямнога жыцця.

Кожны чацвёрты на беларускай зямлі быў забіты ці спалены... а на Віцебшчыне – кожны трэці. Гора і смутак увайшлі сёння да нас.

Штуршкамі крыві ўваходзяць у сэрца словы: "Людзі добрыя, помніце мы любілі жыццё і Радзіму нашу і вас, дарагія. Наша просьба да ўсіх: хай жалоба і смутак абернуцца ў мужнасць і сілу, каб змаглі ўвекавечыць вы мір і спакой на

Зямлі. Каб нідзе і ніколі ў віхры войн жыццё не ўмірала".

*(Музыка "Рэквіем" сціхае)*

Увекавечылі людзі памяць аб загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны. Сведкі гэтаму шматлікія помнікі *(паказваюць).*

Давайце і мы з вамі ўшануем памяць загінуўшых у гады вайны. Запаліце зоркі памяці і адначасова надзеі на тое, што ніколі не будзе гарэць наша беларуская зямля, не будуць гінуць дзеці.

*(Гучыць "Авэ Марыя" Ф.Шуберта)*

***Сёмы вучань.*** Часцей, часцей прыпамінай
Імёны паўшых смерцю храбрых
За родны край, наш мілы край,
Каб над зямлёй, што млела ў ранах,
Цвіў гэты белы-белы май,-
Плыў гэты сіні-сіні ранак
Часцей, мой друг, прыпамінай!
***Восьмы вучань.*** Прыпамінай часцей мой друг,
Імёны тых, што ўсё зрабілі –

Вышэй усіх тваіх заслуг,
Што, як і ты, да слёз любілі
Маністы ўвосень на рабіне
І ў ліпкіх смолках майскі луг, -
Не забывай пра іх мой друг!

***Настаўнік.*** Якая страшная вайна...

Кожны чацвёрты быў мёртвы –
мір і спакой ім вечны!
Кожны трэці быў зmoраны,
скалечаны і знявечаны.

Кожны другі на целе
меў раны, апёкі ці шрамы.
І ўсе мы, усе мы мелі
на душы сваёй раны.

Лічым: кожны чацвёрты,
а той рахунак прыблізны,
а той рахунак няцвёрды,
а ўрон яшчэ больш вялізны.

А.Вярцінскі.

Як горка ўсведамляць, што і сёння ў свеце недзе ідзе вайна.

Чаму? Магчыма, хтосьці не запомніў урокаў мінулага або ў свой час не прачытаў патрэбныя кнігі. Не паўтарайце чужых памылак. Чытайце кнігі пра вайну.

Чытайце, бо менавіта вам жыць у XXI стагоддзі, менавіта вам рашаць, якім будзе гэта стагоддзе, якой будзе наша краіна.

*(Гучыць "Рэквіем" В.А.Моцарта)*

Таварышы, мы звяртаемся да сэрца вашага, да памяці вашай.

Успомнім тых, хто не вярнуўся з вайны, хто не дайшоў з намі да Перамогі".

Няма сям'і, якая не страціла б бацьку, брата, сына, сястру ці дачку. Няма хаты, якую не закранула б ваеннае гора. У кожнага свой рахунак вайне. У маці за сыноў, у чыю гібель яны ніколі не павераць і да самых апошніх дзён усё будуць чакаць і чакаць.

У дзяцей за бацьку, ад якога ў памяці засталіся толькі развітальны пацалунак і моцныя рукі, якія калісьці высока падкідвалі іх.

Праходзяць гады. Яны заўжды з намі, у нас. Не можа быць забвення для тых, хто да апошняй кроплі крыві абараняў нашу Радзіму, хто адстрэльваўся да апошняга патрона ля пагранічных слупоў, хто жыццё аддаў, абараняючы Радзіму. Ніколі не забыць подзвігу абаронцаў Брэсцкай крэпасці, Мінска, Віцебска.

Усіх, хто грудзьмі сваімі прыкрываў кожную пядзь зямлі роднай. Крывёй савецкіх салдат-вызваліцеляў паліта зямля многіх краін Еўропы. Перад подзвігам савецкага воіна схіляецца ўдзячнае чалавецтва *(звон колакала).*

***Настаўнік.*** Хвілінай маўчання ўшануем усіх загінуўшых у Вялікай Айчыннай вайне.

*(Хвіліна маўчання пад гукі метранома.)*

Вечная слава героям, паўшым ў барацьбе за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы. Памяць людская... Яна ў сэрцы кожнага з вас, і менавіта яна, памяць аб вайне, натхніла нашых юных мастакоў і паэтаў на творчасць. *(адкрываю зваротны бок дошкі, на якім размешчаны малюнкі вучняў)* і вось ён, вынік, перад вамі. У памяць аб вайне Саша Ільніцкі і Марына Мароз напісалі вершы пра вайну. Давайце мы зараз іх паслухаем.

***Саша.*** Я бачыў пра вайну кіно...
І сёння... помніцца яно.
Перада мною – цяжкі бой...
Узрывы. Крыкі, куляў рой.
Я бачу слёзы беднай маці,
Што льюцца над труной дзіцяці.
Там смерць і гора, боль і кроў
Не трэба нам вайны ізноў.
Хачу я ў мірным доме жыць,
З людзьмі і кветкамі дружыць.
І бачыць неба, рэчку, сонца
Шчаслівым быць хачу бясконца.

Ільніцкі Аляксандр

***Марына.*** Мой дзядуля Уладзімір Мікітавіч Пілючонак прайшоў усю вайну, удзельнічаў у баях пад Кенінсбергам, а перамогу сустрэў у Польшчы. І хаця ў яго няшмат узнагарод, аб ім не ўпамінаецца ў раённай кнізе “Памяць”, я ганаруся сваім любым дзядулем і прысвячаю яму і сваёй Беларусі верш.

Зямля Беларусі! Прыгожыя нівы.
Зямля Беларусі! Народ твой
руплівы.
Краіна ты славы, краіна ты міру,
Уся ты ўбрана квяціста
і шчыра.
На зямлі тваёй светлай добра
жыць і любіць.
Аб нашэсцях варожых
немагчыма забыць,
І аб кожным чацвёртым,
хто супраць смерці ступіў,
Перамогу ў бітвах нам навекі
здабыў.
Сёння ў школу бягу я,
сёння радасны дзень.
Хай звініць над зямлёю звонкі
жаўранка спеў.

*(Гучыць “Лунная саната” Л. Ван Бетховена)*

**Настаўнік:** Вось і падыходзіць да заканчэння наша размова. Спадзяюся, што яна стала штуршком да роздуму над пытаннем, якою цаной заваёвана шчасце.

Вайну хочацца забыць, цяжка чалавеку жыць з такой жорсткай напружанай памяццю, з такой змучанай душой. Але што будзе з намі, калі ветэраны забудуцца і не перададуць нам сваю памяць? Якімі мы будзем без яе, памяці, ў нашым вялікім і трывожным свеце? Не, іх памяць жыве ў нас. Яна знаходзіць дзясяткі шляхоў, каб не пакінуць чалавечае сэрца. Гэта яна злучае мінулае і будучае. Мінулым таксама трэба жыць, нельга яго аддаваць бяспамяцтву.

Мы з вамі сабралі ўжо шмат матэрыялаў пра вайну. Склалі спісы загінуўшых, ветэранаў, дзяцей-вязняў канцлагераў. Запісалі ўспаміны ветэранаў, удзельнікаў і сведкаў вайны.

Але многае знікае бяссследна. Забываецца. Калі помніць вайну, з'яўляецца шмат нянавісці. Калі вайну забываюць, пачынаецца новая. Так казалі старыя.

Таму я прапаную вам помніць аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны, папаўняць матэрыяламі наш куток баявой славы.

Нельга дапусціць, каб наша моладзь, якая, на жаль, прывыкае да крыві і забойстваў па шматлікіх сюжэтах тэлебачання, успрымала самую лёсавызначальную вайну ў нашай гісторыі як чарговы баявік, а крутых кіношных супермэнаў ведала значна лепш, чым тых, хто ні з чым непараўнальнай цаной даў нам магчымасць жыць, вучыцца і працаваць, радавацца жыццю, якім бы супярэчлівым і складаным яно ні было.

*(Вакальная група выконвае песню на словы С.Сокалава-Воюша "Беларусь мая")*

Аксамітны летні вечар ахінуў зямлю,
Я азёрную сінечу вуснамі лаўлю,
Моўчкі слухаю ў росах песню салаўя...
Над маім лунае лёсам
Беларусь мая!
А над лесам, над Сусветам выпрастаў крыло
Залацісты човен – зорнае вясло.
Стан дзявочы Белай вежы, подых ручая...
Я адной табе належу,
Беларусь мая!
Там, дзе гойдае ветрыска залаты мурог
Паўставалі камяніскі ля тваіх дарог.
Чырванее ранні золак, рэха ў гаях.
А ў грудзях тваіх асколак
Беларусь мая!

## Спіс выкарыстанай літ,аратуры

*Аляхновіч, А.* М. Фальклор у выхаванні школьнікаў / А. М. Аляхновіч. — Мінск: Чатыры чвэрці, 2008. — 200 с.

*Алексиевич, С.А.* "У войны – не женское лицо…"/ А. М. Алексиевич – Мінск: "Мастацкая літаратура", 1985г.

*Арлова, Г. П.* Народная педагогіка як сродак выхавання вучняў / Г. П. Арлова. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2009. — 144 с.

*Барадулін, Р.* Выбраныя творы: у 2 т. / Р. Барадулін. — Мінск: Маст. літ., 1984. — Т. 2. — 335 с.

Беларускія народныя абрады / склад., навук. рэд. і прадм. Л. П. Касцюкавец. — Мінск: Беларусь, 1994. — 128 с.

Беларускае свята ў школе: дапам. для настаўнікаў і выхавальнікаў / аўт.-уклад. Л. В. Пармон [і інш.]. — Мінск: Беларусь, 2002. — 145 с.

*Трухан, М.М.* "Чаканні"/ М.М. Трухан – Мінск: Беларуская навука, 2005